Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

КАСТРЫЧНІК 19 1933 г. ЧАЦВЕР № 231 (4775)

Год выдання XVII

АДКРЫЛАСЯ МЕНСКАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ ГРУППАРТОРГАЎ І САКРАТАРОЎ ЦЭХПАРТ'ЯЧЭЕК

Учора а 7-й гадзіне ўвечары ў клубе імя Карла Маркса адкрылася менская гарадская канферэнцыя группартарганізатараў і сакратароў цэхавых парт'ячэек вытворчых калектываў. Канферэнцыю адкрыў сакратар МенГК КП(б)Б тав. КУДЗЕЛЬКА.

У прэзідыум канферэнцыі выбраны: бюро ЦК КП(б)Б і МенГК КП(б)Б, прэзідыум ЦКК і МенгарКК, рэспубліканская і гарадская камісіі па чыстцы КП(б)Б, сакратары буйнейшых партканклектываў і цэхпарт'ячэек і лепшыя группарторгі.

Пад бурную авацыю выбран ганаровы прэзідыум у складзе т. т. СТАЛІНА, МОЛАТАВА, ВАРАШЫЛАВА, КАГАНОВІЧА, КАЛІНІНА, КУЙБЫШАВА, ОРДЖАНІКІДЗЕ, АНДРЭЕВА, КІРАВА, КАСІЁРА, РУДЗУТАКА, ПОСТЫШАВА, ГІКАЛО, АНЦІПАВА, ТЭЛЬМАНА і ЛЕНСКАГА.

Канферэнцыя працягнецца да 20 кастрычніка. Учора быў заслухан даклад тав. ГЕРШОНА аб некаторых выніках чысткі менскай партарганізацыі і замацаванні рэзультатаў чысткі. Сёння будуць працаваць секцыі. 20-га канферэнцыя абгаворыць вынікі гарадскога конкурса на лепшую партгрупу. Партгрупа, якая заняла першае месца па конкурсу, атрымае на канферэнцыі сцяг. Канферэнцыя прыме рашэнне аб пасылцы на вытворчую экскурсію лепшых групавых партарганізатараў.

ВЫКАНАЦЬ НЕ МЕНШ 45 ПРОЦ. ПЛАНА ТАВАРАЗВАРОТА да КАСТРЫЧНІЦКІХ СВЯТ

Спажывецкая кааперацыя БССР, а таксама сістэма дзяржаўнага гандля не справіліся ў трэцім квартале з усіпадзенымі на іх задачамі. Спажывецкая кааперацыя скончыла квартал з прарывам у 16 млн. руб. «Звязда» ўжо ўказвала на тыя прычыны, якія выклі калі невыкананне плана тавараззарота. Трэба з усёй рашучасцю сказаць, што ў большасці арганізацый спажывецкай кааперацыі паўтараюцца памылкі трэцяга квартала.

Прайшлі амаль дзве дэкады чацвертага квартала. У гэтым квартале сістэма павінна прадаць непараўнальна больш тавараў, чым у мінулым. Калі ў трэцім квартале план тавараззарота складаў 131 млн. руб., дык да канца года спажывецкая кааперацыя павінна даць 146 млн. і пакрыць прарыў у 16 млн. руб. Гэта задача безумоўна складаная, але яна зусім рэальная і яе можна выканаць.

Як-жа мабілізавана гандлёвая сістэма на ажыццяўленне гэтага задання?

Калі мы прааналізуем работу спажывецкай кааперацыі і дзяржгандля хоць-бы за першую дэкаду гэтага месяца, мы прыдзем да вызадаў аб тым, што работа праходзіць нездавальняюча. Спажывецкая сістэма ў цэлым працуе на дапушчальна слабымі тэмпамі. План тавараззарота за першую дэкаду выкананы на 21,8 проц. месячнага задання.

Вопыт перадавых райсаюзаў, міжрайбаз і сельСТ паказвае, што сістэма спажывецкай кааперацыі можа не толькі выканаць, але і перавыканаць план тавараззарота. Здолеў-жа АРШАНСКІ райсаюз (старшыня тав. ПЕСІН) за першыя паўтары дэкады выканаць амаль 50 проц. квартальнага задання. Уся справа ў арганізацыі і метадах работы. Аршанскі райсаюз вывучае попыт насельніцтва, ён шырока ўжывае метады папярэдніх заказаў. На аснове вывучэння попыта ён разгортвае па-запланавым закупкі. Гандаль у радзе ССТ Аршаншчыны перанесен непасрэдна ў калгас, брыгаду. Прыводзім такі факт. Крамнік КАНТАРОЎСКІ (Дубровенскае ССТ) носіць тавары—мыла, махорку, ніткі і інш. тавары ў калгасы, дзе няма крам, прыносіць тавары ў хату і прадае калгаснікам. На жаль, такія работнікі, такія сельспажыўтаварыстаў налічваюцца ў нас адзінкамі.

Белкаапсаюз узяў на сябе абавязак сустрэць XVI гадавіну Кастрычніка ВЫКАНАННЕМ НЕ МЕНШ 45 ПРОЦ. ПЛАНА ТАВАРАЗВАРОТА 4 квартала. Гэта абавязацельства яшчэ не падхоплена мясцовымі кааперацыйнымі арганізацыямі. Вакол выканання гэтых задач не разгорнута сапраўднае соцыялістычнае спаборніцтва паміж сельспажыўтаварыствамі, райсаюзамі і міжрайбазамі. Больш таго, у большасці арганізацый, асабліва ў ССТ, не ведаюць аб гэтым абавязацельстве—райсаюзы не пахпапяліся даўт папулярызаваць пастанову Белкаапсаюза.

ПЛАН ТАВАРАЗВАРОТА Ў ЧАЦВЕРТЫМ КВАРТАЛЕ — ГЭТА ПЛАН ЗАДАВАЛЕННЯ ЎЗРАСТАЮЧЫХ ПАТРАБАВАННЯЎ КАЛГАСНІКАЎ, ЯКІЯ СТАНОВЯЦЦА ЗАМОЖНЫМІ. Таму першачарговы абавязак спажывецкай кааперацыі так складці план, так забяспечыць яго выкананне, каб не паўтаралася памылкі мінулага квартала. Нельга далей дапусціць, каб у крамах адсутнічалі тавары, патрэбныя калгасніку, патрэбныя рабочаму. Прыходзіцца канстатаваць, што да гэтага часу ў радзе месц злачынна ігнаруюць павышаны попыт працоўных. Да гэтага часу не зломлен себатаж гандля дастатковымі таварамі. Амаль усе райсаюзы, ЦРК і ЗРК не выконваюць план гандля пасудна-гаспадарчымі таварамі. Белкаапсаюз і ў першай дэкадзе не ўдарыў, як належыць, па «таварабаязні». Гапан тарэю і па сённешні дзень у радзе арганізацый цяжка знайсці.

Не выбіты дагэтуль з мазгоў кааператараў імкненні гандляваць таварамі абмежаванага асартымента: мануфактурай, абуткам, гатовай вопраткай, гандляваць старымі метадамі, чакаць прыхода пакупцоў і прысылкі тавараў.

Да гэтага часу недапушчальна слабая ўвага аддаецца ўмацаванню і перабудове нізавога кааперацыйнага звяна—ССТ. Рад фактаў аб сабатажы гандля, аб кулацкіх тэорыях «зніжэння попыта спажыўца» гавораць аб тым, што спажывецкая кааперацыя яшчэ не вачышчана ад класава-чужых элементаў.

Трэба неадкладна выгнаць з усіх звенняў спажывецкай кааперацыі кулацкае ахвосце, агентаў класавага ворага. Вырашэнне гэтай задачы немагчыма без удзела партыйных арганізацый і палітаддзелаў МТС.

Вялікую ўвагу трэба зараз звярнуць на РЭНТАБЕЛЬНАСЦЬ і бясстратнасць работы ССТ. Гэту задачу можна з поспехам выканаць пры актыўным удзеле ў рабоце кааперацыі органаў грамад юкага кантроля, пры сапраўдным кіраўніцтве і ўдзеле парт'ячэек, сельсоветаў і іх масавых звенняў. Трэба штодзённа правяраць, як ССТ улічвае ўсе патрабаванні калгасніка і калгасаў, як яно выкарыстоўвае ўсе магчымасці па адшукванні патрэбных таварных рэсурсаў.

СельСТ Беларусі нясуць недапушчальна вялікія расходы па транспарту тавараў. Гэтага нельга далей дапусціць. Кожнае сельспажыўтаварыства па прыкладу РОСТКА-СЕЛЕЦКАГА павінна заключыць з абслугоўваемым ім калгасам дагавор на ільготную дастаўку тавараў.

«Рэзкае павялічэнне колькасці тавараў у чацвертым квартале як у закрытай, так і ў адкрытай сетцы, ліквідацыя дэфіцытнасці многіх тавараў вымагаюць усямернага павышэння якасці гандлёвай работы. Выканаць азіяцкія метады гандля, канчаткова пакончыць з прымусовым асартыментам, навесці чыстату і парадак у магазіне, далікатна абыходзіцца з пакупцом — гэтыя элементарныя задачы павінны быць вырашаны як мага хутчэй» («ПРАВДА»).

Насустрач новаму ўраджаю трэба кінуць максімум таварных рэсурсаў. Прамысловасць павінна мабілізаваць усе сілы на своячасовае выкананне планаў адгрузак. Гандлюючыя арганізацыі павінны канчаткова адмовіцца ад практыкі простай рэгістрацыі складання зводак аб адгрузцы тавараў. Спажыўкааперацыя павінна актыўна ўздзейнічаць на пастаўшчыкоў, штодзён на месцы за асартыментам адгружаных тавараў, адначасова змагацца за максімальнае выкарыстанне мясцовых дадатковых рэсурсаў.

Першыя паўтары дэкады КАСТРЫЧНІКА паказваюць, што спажыўкааперацыя не рашуча прад'яўляе свае патрабаванні да чыгункі. На мільёны рублёў тавараў, прызначаных для СельСТ, ляжаць тыднямі запакаваныя, гатовыя да адгрузкі на базах (Менская міжраённая база, дырэктар Клісінскі). У рэзультаце замаражваецца тавараззарот, спажывец несваячасова атрымлівае патрэбны яму тавар.

Тавараззарот у чацвертым квартале мае велізарнае народна - гаспадарчае значэнне. Поспех выканання плана тавараззарота ў першую чаргу залежыць ад самой кааперацыі і безумоўна ад таго, як партыйныя, савецкія арганізацыі здолеюць аказаць практычную дапамогу сістэме кааперацыі і дзяржгандля.

Неабходна зверху да нізу, пачынаючы ад Белкаапсаюза, міжрайбазы, канчаючы райсаюзам і ССТ, перамагчы самацёк у рабоце, адмовіцца ад канцылярска-бюракратычных метадаў кіраўніцтва сістэмай, разгарнуць сапраўднае спаборніцтва вакол ажыццяўлення задач, пастаўленых партыяй перад спажыўкааперацыяй у галіне тавараснабжання горада і вёскі.

СПРАВА ГОНАРУ СПАЖЫЎКААПЕРАЦЫІ БССР — ЗАВАЯВАЦЬ ПРАВА НА РАПАРТ ДА XVI ГАДАВІНЫ КАСТРЫЧНІКА АБ ВЫКАНАННІ НЕ МЕНШ 45 ПРОЦ. ПЛАНА ТАВАРАЗВАРОТА І ВЫЙСЦІ НА ПЕРАДАВЫЯ ПАЗІЦЫІ Ў САЮЗЕ.

АБ ХОДЗЕ ЗЯБЛІВА

Пастанова Совета Народных Камісараў БССР

Совет Народных Камісараў БССР адзначае, што большасць раёнаў, дырэктараў МТС і саўгасаў не ўпічылі ўрокаў веснавой сяўбы ў радзе раёнаў і не перавыканалі зяблёва ў сапраўдных сродак барацьбы за ўздым ураджайнасці, за раннія тэрміны выканання веснавой сяўбы будучага года.

Асабліва бяздзейнічаюць раённыя выканаўчыя камітэты, райсаюзы і МТС раёнаў: Бешанковіцкага, выканаўшага на 10 кастрычніка г. г. план зяблёва на 2,4 проц., Асвейскага—на 4 проц., Чашніцкага—4,2 проц., Уваравіцкага—4,9 проц., Лёзненскага—5,7 проц., Асіпавіцкага—6,4 проц., Сенненскага—7,3 проц., Брагінскага—7,4 проц., Суражскага—7,7 проц., Горацкага—8,2 проц., Лепельскага—8,4 проц., Дубровенскага—8,9 проц., Чырвонапольскага—9,5 проц., Мсціслаўскага—11 проц., Рясонскага—7,9 проц., Ушацкага—10 проц., Сіроцінскага—6,3 проц. і Крупскага—7,6 проц.

Па сістэме ўпаўнаважанага Наркамсаўгасаў зазяблена 11,1 проц., прычым асабліва бяздзейнічаюць саўгасы: магілёўскага свінаводтрэста, які выканаў план на 2,6 проц., менскага свінаводтрэста—на 8,6 проц. і птушкатрэста—8,3 проц.

Гэта з'яўляецца ў асноўным вынікам надзвычайна дрэннага выкарыстання саўгасамі трактарнага парка і жывой цягавай сілы.

Улічваючы асаблівую небяспеку ў адставанні па зяблеву пералогных раёнаў, пераважна на цяжкіх глебах, і саўгасаў, у якіх зяблева з'яўляецца рашаючым сродкам своячасовага выхада ў поле вясной будучага года, Совет Народных Камісараў БССР пастанаўляе:

1. Папярэдзіць старшынь раённых выканаўчых камітэтаў, загадчыкаў райсаюзаў і дырэктароў МТС, трэстаў і саўгасаў, што яны асабіста адказваюць перад СНК за выкананне плана зяблёва і што невыкананне гэтага плана будзе разглядацца, як зрыў пасяўкампаніі.

2. Прапанаваць усім старшыням раённых выканаўчых камітэтаў, загадчыкам райсаюзаў, дырэктарам саўгастрэстаў, МТС і саўгасаў усіх раёнаў і асабліва вышэйпералічаных бязадказна правяць арганізацыю работ у калгасах, саўгасах і выканаць пастановы Наркамзема і ўпаўнаважанага НК Саўгасаў аб вылучэнні ў саўгасах пастаянных рабочых, а ў калгасных брыгадах асобных звенняў па выкананню зяблёва.

3. Совет Народных Камісараў патрабуе ад раённых выканаўчых камітэтаў, райсаюзаў, МТС і саўгасаў у бліжэйшыя дні дабіцца пералома ў выкананні плана на зяблеве з тым, каб у бліжэйшыя 1-2 пяцідзённі план зяблёва быў поўнасцю выкананы.

Совет Народных Камісараў папярэджвае, што план зяблёва г. г. з'яўляецца мінімальным, і ставіць перад усімі РВК, саўгастрэстамі, МТС і саўгасамі задачу не толькі безагаворачна і добраякасна яго выканаць, але і перавыканаць.

Старшыня Совета Народных Камісараў БССР М. ГАЛАДЗЕД.

Нам. кіраўніка спраў СНК БССР А. МАЦКО.

УСЕБЕЛАРУСКАЯ ІЛЬНАЭСТАФЕТА

ЯКАСЦЬ ІЛЬНАВАЛАКНА—У НАШЫХ РУКАХ

Па прыкладу пролетарцаў памнажайце ўзоры лепшых, дабівайцеся добраякаснага ільнавалакна

Слова трох брыгадзіраў

Філімонаў Васіль

брыгадзір першай брыгады калгаса „Пролетары", Дрысенскага раёна

Спаборніцтва працаваць навучыла

Часта ў мяне пытаюць: чаму гэта, Васіль, лён у вас добры парос? Што за сакрэт? І потым гэты-ж самы чалавек кераканваецца, што ўвесь сакрэт у добрай і дбайнай апрацоўцы гэтай капрызнай культуры.

Прыкладам у мяне ў брыгадзе 23 чалавекі. 16 з іх яшчэ ранняю вясною я замацаваў на лён. Як толькі адтала зямля, мы добра ўзаралі глебу, вылежалася яна, а потым і засеялі ільном. Насенне адбіралася толькі гатункавае, сеялі мы пераважна «куцраш», радзей «даўгунец». А каб не стварылася так, што лён разам паспее і мы не ўправімся адразу ўбраць—прыйшлося правесці ўчасткавую сяўбу. Палолі лён да 3-х разоў. За высіваннем, уборкай, а потым і за апрацоўкай сачыў **Фёдар Баравік.** Не толькі ён, а ўся брыгада сачыла за вымачкай, рассцілам трасты, таму ў нас не сапсавалася ніводнае каліва. Сачыць, шанаваць лён навучыў нас леташні год, калі з-за нядбайных адносін зчіла амаль палова трасты, за тое-ж сёлета мы і давялі страты да нуля. Мочна вязалі, кулі і адразу-ж сухую трасту адвозілі на ільназавод. Да 2-га кастрычніка мы поўнасцю разлічыліся з дзяржавай, выканаўшы заданне па якасці на 115 проц. Пры здачы наш лён прымаўся не ніжэй 1,75—2 нумароў.

Мая брыгада спаборнічала з 3-й брыгадай нашага калгаса. І ўпутры самой брыгады разгарнулася спаборніцтва і не толькі па кольках, а пераважна па якасных паказчыках.

Памятаю: **Талкуй Вера** ніяк не спраўлялася з нормаю—маладая, не прывыкла яшчэ да работы. Затое **Усціновіч** Таццяна замест нормы 0,10 га штодня выбірала 0,13, а потым узяла ды і выклікала Веру спаборнічаць. Глядзю: на заўтра і тая норму выпрацавала, потым з Таццянаю зраўнялася, а пад канец дзень у дзень 0,16 выпрацоўвала. Дзівіліся бабы дый толькі.

Гледзячы на маладых, і старыя ўзяліся за работу. Цётка **Хоцькава** пражыла 69 гадоў (апошні час ужо непрацаздольнай лічылася), а гляджу адзе да мяне на ільнішча.

— Куды—пытаю,—цётка?

— Глядзела гэта я, як Вера звіхаецца, ды і мяне ахвота ўзяла, дык от і прышла крыху павыбраць.

Да вечара бабуля Хоцькава 0,07 выбрала, потым да апошніх дзён сама на работу хадзіла, а калі паслалі лён, хадзіла дзівіцца, як траста вылежваецца. А сёння сустрола мяне па бульбянішчы і давай дакытваць, як лён здалі, па якому нумару прынялі яго.

От, так спаборнічаючы і змагаючыся за лён, мы дамагліся высокай якасці, а наш сельсовет першым ідзе ў раёне па здачы ільну.

Ваяводаў Кастусь

брыгадзір 3-й брыгады

Як робіцца высокі нумар

Хоць і менш у нас ільну было, і людзей менш, але наша брыгада ўвесь час спаборнічала з брыгадай Васіля Філімонава.

Нашы жанчыны казалі: «Ні каліва прапажы», «здаць не ніжэй другога нумара». Таму, як толькі зашамрэлі галоўкі і пажаўцеў лён, брыгада разбілася на групы, групы ўзяліся спаборнічаць, калі быў час—на пакеры пісалі ўмову, а то адмераем роўныя ўчасткі—і пайшлі працаваць—хто хутчэй і лепш выбіра. І так да апошніх дзён. Выцерабіўшы, снапы саставілі ў конусы.Ачысвалі лён спецыяльнымі нажамі і адразу звозілі на мачыльнічы. Замочвалі адразу не менш 15-20 кон, а калі ішлі дажджы, уся траста выцягвалася з ямаў, бо свежая вада магла пашкодзіць ільну. Не давалі мокнуць больш 6-7 дзён.

Трасту рассцілалі на скошаным лузе. У жнівеньскія росы за рэгулраванаю трастаю сачылі штодня, а як толькі пачынала валакно адлузвацца ад трасцёны—пасылаліся людзі для сартоўкі, каб далей не пусціць гнілі. Так мы сабралі трасту, упікнуўшы страт. Сухія снапы адразу адвозіліся на Боркавіцкі ільназавод. Добры догляд, клопаты забяспечылі здачу трасты пераважна 2-га нумара.

Кладніцкі В.

[брыгадзір другой брыгады

Мая брыгада дабілася высокай якасьці

— Наша другая брыгада здала сёлета дзяржаве лён высокаякасны, пераважна другога нумара. А дамагліся мы гэтага ўпартаю работаю, што дзеннымі клапотамі.

Праполка ішла ў нас 2-3 разы. Пры мочцы сартавалі лён па сухасці, па даўжыні каліва.

Асаблівую ролю адыграла ў нас соцыялістычнае спаборніцтва. Як ірвалі лён, дык норму ўстанавілі на адну дзяўчыну—0,10 га, а знайшлося шмат такіх, што па 0,15 га за дзень вырывалі. Усё дзякуючы спаборніцтву.

Вось вам прозвішчы лепшых нашых працаўнік: **Ваводава Прося, Кладніцкая Марыя, Кладніцкая Наста, Бабчонак Ганна.**

Як ірвалі лён, дык адразу яго і станавілі. Мы прывозім, яго абразаюць, зноўку стаяць. Цяпер прывёз ны, паставіўшы, растраўляем, выпростваем, разгладжваем галоўкі, каб валакна не рвалі.

Накладаем казёл, касою не ражам, а толькі акуратна нажамі. Абрэзаны лён становім. Коп 30 абрэжам—і за сартоўку: сухі—да сухога, кароткі—да кароткага.

За рассцілам сачылі, каб не густа ляжаў лён, каб не на зямлі голай ляжаў, а на іржышчы ці на сенажаці. А летась не тое было. Летась зняло шмат, амаль увесь лён згнаілі. 1,25—самая якасць была. Адносіны былі дрэнныя, ды да таго-ж позна пасеялі.

Летась варожыя элементы сваю лінію гнулі. А як выкінулі мы з калгаса Філімонава Алеся, Чаркаса Васіля, Каваленьку Алеся, Шымана Рыгора—добра справа пайшла.

Уцямілі ў нас калгаснікі значэнне ільну і цяпер іншы разважаюць:

— Калі мы здамо дзяржаве добраякасны лён, дык нам і хлеба даволі дадуць.

Загатоўлена ўсяго 5,2 проц. ільнавалакна

Зводка аб ходзе загатовак ільнавалакна па ільнаводчых раёнах БССР на 15 кастрычніка 1933 г. (у процантах)

Назва раёнаў	Загатоўлена трасты	Загатоўлена ільнавалакна	Усяго
АСВЕЙСКІ	14,1	—	10,9
БЕШАНКОВІЦКІ	12,2	0,04	9,1
БЯЛЫНІЦКІ	5,3	0,04	3,1
УШАЦКІ	13,0	0,4	5,4
ГАРАДОЦКІ	6,9	—	3,8
ГОРАЦКІ	1,5	0,6	1,0
ДРЫСЕНСКІ	55,6	0,2	48,0
ДУБРОВЕНСКІ	1,6	0,1	0,9
КРУПСКІ	1,6	0,1	0,5
ЛЁЗНЕНСКІ	3,4	0,2	2,3
ЛЕПЕЛЬСКІ	3,2	0,4	2,0
МСЦІСЛАЎСКІ	0,6	0,9	0,7
ПОЛАЦКІ	52,2	1,1	31,5
РАСОНСКІ	2,5	0,4	1,8
СЕННЕНСКІ	51,5	2,5	26,0
СІРОЦІНСКІ	4,4	—	3,1
СУРАЖСКІ	11,8	0,1	0,5
ТАЛАЧЫНСКІ	11,0	0,5	7,5
ЧАВУСКІ	1,3	0,2	0,7
ЧАШНІЦКІ	5,4	1,5	3,6
ШКЛОЎСКІ	3,9	1,2	2,9
Усяго па ільнаводчых раёнах	12,2	0,5	7,5
Усяго па БССР	11,1	0,3	5,2

Раённая канферэнцыя лепшых трапальшчыц

СЕННО. (Па тэлеграфу).

У раёне разгарнулася масавая апрацоўка ільну. Перадавыя калгасы пры апрацоўцы ільну ўвялі прагрэсіўна прэмыяльную здзельчыну і сістэму працэнтных прэмій за лепшую апрацоўку ільну. Гэтымі мерапрыемствамі яны дабіліся павышэння норм выпрацоўкі да 15-20 фунтаў ільнавалакна па кожную ільнатрапальшчыцу. Якасць ільнавалакна яшчэ невыстарчальная.

Для мабілізацыі актыўнасці калгаснік па выкананне ўдарных норм выпрацоўкі і высокую якасць 25 кастрычніка ў раёне склікаецца канферэнцыя трапальшчыц. Права ўдзела ў канферэнцыі атрымаюць тыя трапальшчыцы, якія апрацоўваюць не менш 10 фунтаў валакна штодзённа.

У звязку з канферэнцыяй ва ўсіх калгасах праводзяцца вытворчыя парады.

Раённыя КК-РСІ і рэдакцыя «Комунар» уключыліся ў сталінскую эстафету за арганізацыю добраякаснай апрацоўкі ільнапрадукцыі і своячасовую здачу яе дзяржаве. У **Ульянаўскі** сельсовет выехала брыгада райКК-РСІ і раённай рэдакцыі. Брыгада паставіла перад сабой задачу—вывесці сельсовет з адстаючых у перадавыя.

Траста псуецца на сцелішчах

ЛЕЗНА. (Па тэлеграфу).

Трэцяя пяцідзённка кастрычніка не дала пералома ў ходзе кераапрацоўкі і здачы ільнапрадукцыі. Пастанова абвіднанага пленума райкома і райКК аб тым, каб зрабіць раён узорным па ільну, даўно забыта.

У раёне зусім не змагаюцца за якасць ільнапрадукцыі. Раней са спазненнем ішоў абмалот і расціл. **Зараз з некаторых сельсоветаў пасту паюць весткі аб псаванні трасты на сцелішчах.** За лежкай трасты зусім не сочаць.

Лёзненскі, Горбаўскі, Каралеўскі і Гладанскі ільназаводы фактычна яшчэ не пачалі загатаўляць трасту. Толькі адзін **Высачанскі** ільназавод (дырэктар Нумпер) арганізаваў загатоўку трасты. План загатовак трасты выкананы па раёну ўсяго на 2 проц. Спасылаючыся на розныя аб'ектыўныя прычыны (маладзьба і сушка збожжа), у раёне ігнаруецца ручная пераапрацоўка. За ўвесь час паступіла ўсяго 57 цэнтн. ільнавалакна, што складае менш 1 проц. гадавога плана.

Усе гэтыя факты сведчаць аб адным—раён уключыўся ў сталінскую ільнаэстафету толькі **фармальна.** Вядучая тэхнічная культура—лён—забыта.

А. М.

УСЕБЕЛАРУСКІ РЭЙД ЦКК і „ЗВЯЗДЫ"

Чыгунка можа і павінна забяспечыць высокія тэмпы адгрузкі

Дзень 16 кастрычніка, калі было адпраўлена звыш 11.000 тон бульбы, паказвае поўную магчымасць выканаць план датэрмінова

23 РАЁНЫ ВЫКАНАЛІ ЗАДАННЕ

НАСТУПНЫЯ РАЁНЫ ПОЎНАСЦЮ ВЫКАНАЛІ ПЛАН АДГРУЗКІ БУЛЬБЫ ЛЕНІНГРАДУ: АРШАНСКІ, АСВЕЙСКІ, БЕШАНКОВІЦКІ, ВЕТКАЎСКІ, ВІЦЕБСКІ, УЗДЗЕНСКІ, ГАРАДОЦКІ, ДРЫСЕНСКІ, ЖЛОБІНСКІ, БАРЫСАЎСКІ, КАМАРЫНСКІ, ДЗЯРЖЫНСКІ, ЛЕЛЬЧЫЦКІ, МЕНСКІ, НАРАЎЛЯНСКІ, ПОЛАЦКІ, СЕННЕНСКІ, ТАЛАЧЫНСКІ, ТУРАЎСКІ, УШАЦКІ, ПЕТРЫКОЎСКІ, ЧЭРВЕНСКІ і ЧЭРЫКАЎСКІ.

ДЗЕНЬ НА ПРЫЁМЦЫ

КАПЫЛЬ. Цімкаўскі перавалачны пункт канторы Плодагародніны прымае і адпружае бульбу Ленінграду, частку прадукцыі ён буртуе па месцы. Пункт мае 10 загружаных складаў. На сённешні дзень на складах скапілася 678 тон.

ЗДАЮЦЬ ГНІЛУЮ БУЛЬБУ

На адным са складаў, дзе працуе прыёмшчык **РАМАНОВІЧ,** ляжыць 50 тон бульбы, палова якой зусім дробная і не адпавядае кандыцыям. Такую бульбу міжраённая кантора не прымае. Пераваллачны пункт вымушан яе перабраць. Узнікае пытанне—куды дзенуць дробную бульбу? Аб гэтым кіраўнікі канторы яшчэ не падумалі.

На другім складзе, якім загадвае прыёмшчык **ЮШКЕВІЧ,** ляжыць каля 80 тон. З гэтага склада бульбу пасылаюць на аўтамашынах у Слуцак. Тут вельмі дрэнна арганізавана адгрузка. Кантора Белплодагародніны не забяспечыла склад мяхамі. Каля машын і склада валяцца шмат бульбы, якую топчуць нагамі. Двор не забрукаван, шмат бруду, машыны з-за гэтага буксуюць.

АЎТАМАШЫНЫ НЕ ЗАГРУЖАНЫ

Грузавікі часта недагружаны. Шоферы бяруць груз не больш як 70 проц. ёмістасці машыны. Замест чатырох рэйсаў у дзень, робяць два. Кіраўнікі пераваллачнага пункта на гэта не зварачаюць увагі.

Нядаўна быў такі выпадак. Усю тару паслалі ў Слуцак, а назад не забралі. На заўтра прыйшлі некалькі машын, і вярнуліся без груза, бо на пункце це было мяхоў і скрынь.

Пераваллачны пункт не забяспечан вагамі. На адным са складаў два дні прымалі бульбу па невызначаных вагах, якія паказвалі значна менш фактычнай вагі. Інакш як абкрадваннем здатчыкаў такі факт кваліфікаваць нельга.

У ЦІМКАВІЧАХ АШУКВАЮЦЬ ЗДАТЧЫКАЎ

Яшчэ горш справа на прыёмачным пункце цімкаўскага бровара. Тэхніка прыёмкі так пабудавана: работнік **КРЭЙНБЕРГ** важыць бульбу, работнік **БЕРАЗОЎСКІ** прымае яе. Ні першы, ні другі не сочаць за якасцю. Калгас імя К. Маркса, Ланцуцкага сельсавета, здаў чарнявую, мокрую, неперабраную прадукцыю. Калгас «Чырвоны дырыжабль» (старшыня **ЛАПОТКА**) прывёз сырую дробную бульбу.

Замест таго каб прымаць бульбу добрай якасці, згодна стандарта, работнікі бровара прымаюць усякі брак і робяць незаконныя скідкі ад 8 да 10 проц. Яны добра ведаюць, што гэтыя скідкі незаконныя, і таму не паказваюць у квітках фактычную вагу прынятай бульбы, указваючы тую колькасць, якая застаецца пасля скідкі. Сотні цэнтнераў бульбы не прыходуюцца, і ніхто не можа гарантаваць, што прадукцыя не раскрадваецца.

Завод стаў на шлях ашуквання здатчыкаў. Ён не ўплачвае м'грашы ма, якія належаць за высокую крухмальнасць, згодна закона. Прымаемая бульба павінна мець не менш 16 проц. крухмальнасці. За кожны лішні процант завод павінен даплаціць 25 руб.

Брыгада РКК-РСІ і друку — ХАРХУРЫН, ТРУМПАКАЙС, ШТАРКЕР.

ХОД АДГРУЗКІ БУЛЬБЫ ЛЕНІНГРАДУ

(На 17 кастрычніка, у тонах)

Назва арганізацыі	План	Адгружана: За дзень	Адгружана: З пачатка кампаніі	Проц. выкан. плана
Белкаапгароднціна	157.270	8.254	121,601	77,3
Белплодагароднціна	113.000	3.624	77.042	68,2
УСЯГО:	270.270	11878	198.643	73,5

Зрываюць адгрузку

Наступныя раёны зрываюць адгрузку бульбы Ленінграду, не забяспечваюць ударных тэмпаў уборкі і паставак:

Чырвонапольскі раён—11,6 проц., Лоеўскі—26,6 проц., Лагойскі—29,8 проц., Рэчыцкі—29,7 проц., Уваравіцкі—39,3 проц., Пралойскі—41,8 проц., Парыцкі—46,9 проц., Глускі—41,4 проц., Крупскі—46,0 проц., Мсціслаўскі—51 проц., Хойніцкі — 51,8 проц., Церахаўскі—53,3 проц., Любаньскі—57,5 проц.

ЗАВАЯВАЦЬ ПРАВА НА МАНДАТ

(Да 3-га ўсебеларускага з'езда калгаснікаў-ударнікаў)

Вялікімі поспехамі ў барацьбе за заможнае жыццё сустракае калгасная вёска XVI гадавіну Кастрычніцкай рэвалюцыі. Дзесяткі і сотні тысяч былых серадняковаў і беднякоў, якія раней удосталь хлеба не елі, ударнай большэвіцкай працай на палях заваёўваюць сытае, культурнае, заможнае жыццё.

— Дабіцца ў наступным годзе ўраджаю і дахода на працадзень яшчэ больш высокага, чым сёлета. Пад гэтым бявым позунгам разгортваецца зараз у калгасах праца па падрыхтоўцы да XVI гадавіны Кастрычніка.

Лепшыя калгасы, лепшыя калгаснікі-ўдарнікі ўзорнай большэвіцкай барацьбой за датэрміновае выкананне збожжапаставак, за высокаякаснае завяршэнне азімай сяўбы і зяблёва, за добрую падрыхтоўку жывёлы да зімы заваюць права пасылкі дэлегатаў на трэці ўсебеларускі з'езд перадавых ударнікаў-калгаснікаў, які склікаецца ў Менску напярэдадні XVI гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі.

Ва ўсіх раёнах БССР трэба неадкладна разгарнуць падрыхтоўку да гэтага з'езда. Трэба шырока разгарнуць соцыялістычнае спаборніцтва вакол права на мандат, права пасылкі дэлегатаў на з'езд, права ўдзелу ў калгаскай канферэнцыі на кастрычніцкай дэманстрацыі ў сталіцы БССР — Менску.

Што трэба зрабіць, каб заваяваць гэта права на мандат?

Марудкімі тэмпамі выконваецца гадавы план збожжапаставак. Асабліва ганебна адстаюць Лепельскі, Заслаўскі, Суражскі, Лёзненскі, Мсціслаўскі, Сіроцінскі, Дубровенскі раёны, занесеныя на чорную дошку.

Асноўнай умовай для заваявання права пасылкі дэлегатаў на з'езд з'яўляецца НЕАДКЛАДНАЕ ВЫКАНАННЕ ЗБОЖЖА - БУЛЬБАПАСТАВАК, ПАСТАВАК ІЛЬНАСЕМЯНІ, ІЛЬНАВАЛАКНА, НАТУРАПЛАТЫ І ВЫСОКАЯКАСНАЕ ЗАВЯРШЭННЕ АЗІМАЙ СЯЎБЫ.

Кастрычніцкую гадавіну ні адзін калгас, ні адзін сельсавет, ні адзін раён нашай рэспублікі не мае права сустракаць з якой-небудзь запазычанасцю перад дзяржавай па здачы збожжа, бульбы, ільнанасення, каналепь, малака, мяса і выканання іншых абавязкаў перад дзяржавай.

Гэтыя моманты з'яўляюцца першымі і асноўнымі ўмовамі для атрымання права на мандат.

ДРУГАЯ ЎМОВА — ВЫСОКАЯКАСНАЕ ЗАВЯРШЭННЕ ЗЯБЛІВА. Наступілі самыя рашаючыя, самыя адказныя тэрміны для хутчэйшага ворыва зяблёва. Кожны дзень спазнення з ворывам зяблёва з'яўляецца ўдарам па ўраджаю 1934 года.

Весь чаму выкананне планаў зяблёва і ўздыму цаліны з'яўляецца галоўнай задачай усіх сельсоветаў і калгасаў. Ужо ігнаруюцца і патрэбуюцца тэмпы выканання збожжа і бульбапаставак, трэба ўсе сілы калгасаў мабілізаваць на выкананне планаў зяблёва.

Трэцяй умовай з'яўляецца ВЫСОКАЯКАСНАЯ ПАДРЫХТОЎКА ЖЫВЁЛЫ ДА ЗІМЫ. Разгортваннем рамонта і будаўніцтва абор, свінарнікаў, стайняў, стварэннем патрэбных фондаў грубых, сакавітых і канцэнтраваных кармоў дабіцца таго, каб калгасныя фермы сапраўды павялічылі каштоўнасць працадня кожнага калгасніка.

Рад раёнаў БССР (Слуцк, Бабруйск і інш.) абавязаліся да Кастрычніцкай гадавіны надзяліць бескароўных калгаснікаў цёлкамі. Прыкладу гэтых раёнаў павінны паследаваць усе раёны БССР. Мы павінны дабіцца таго, каб у нас не было ні аднаго бескароўнага калгасніка.

Пролетарыят горада Леніна, які увесь час трымае шчыльную сувязь з працоўнымі БССР, запрасіў нашых калгаснікаў на з'езд калгаснікаў-ударнікаў Ленінградскай вобласці. Пастановай ЦК КП(б)Б, якая ўчора надрукавана ў нашай газеце, на гэты злёт едуць калгаснікі ДРЫСЕНСКАГА, АРШАНСКАГА і БАРЫСАЎСКАГА раёнаў — перадавікоў ус

ПАРТЫИНАЕ БУДАЎНІЦТВА

СОЦЫЯЛІСТЫЧНАЕ СПАБОРНІЦТВА—АСНОЎНЫ МЕТАД ПАЛЯПШЭННЯ ЯКАСЦІ МАРКСІЦКА-ЛЕНІНСКАГА ВЫХАВАННЯ

Партвучоба--адказнейшая задача партарганізацыі

(На ўсебеларускай культпропнарадзе)

Чыстка партыі глыбока ўскрыла стан тэарытычнага ўзроўня членаў і кандыдатаў партыі. Лічбы пераверэнных у кандыдаты і спачуваючыя, якія падавалі выступаўшыя на нарадзе, вельмі пераканаўча паказваюць, наколькі ў нас кепская абстаўка з партвучобай.

Зусім зразумела, што з такіх сумных фактаў раённыя і гарадскія к—тэты павінны былі своечасова зрабіць адпаведныя высновы. Аднак, на жаль, гэта далёка не ўсюды было зроблена.

Вельмі многа на нарадзе гаварыў аб прапекландыстах. Райкомы скарыстаюцца на недахват кіраўнікоў школ. Чаму? Таму, што пэўнага арганізоўваюць справу. У новых умовах работы ў вёсцы, ва ўмовах, калі ў вытворчай ячэйцы 4,5, а то і 3 чалавекі, значна складнейей арганізаваць партвучобу. Школ у гэтым годзе ў раёнах значна больш, чым у мінулыя гады. Апарата таго вялікае месца займае вучоба адзіночак. Вырас партыйны актыў, які патрабуе больш кваліфікаваных кіраўнікоў. Гэта значыць, што прапагандысцкія кадры павінны рацыянальна выкарыстоўвацца, што трэба систематычна высоўваць і выхоўваць новых прапагандыстаў і супёжна працаваць з імі. Якраз гэтага ў раёнах няма. Аб гэтым гаварыла большасць выступаўшых у спрэчках па дакладу заг. культпропам ЦК тав. **Тамаркіна.**

Асноўная форма вучобы прапагандыстаў — гэта семінары. Кіраўнікі семінараў павінны быць пяснейшым чынам звязаны з прапагандыстамі і наглядаць за імі не толькі пры разы ў месяц—у дні заняткаў семінарыя, але і наглядаць за тым, як яны працуюць у школах. Між тым справа арганізавана так, што за прапагандыстамі наглядз няма. Тав. **Камерац** даказаў гэта характэрным прыкладам:

У Віцебску кіраўнік прапсемінарыя аднят яраз у той дзень, калі прахадзіць партвучоба і тэму не мае магчымасці бачыць сваіх прапагандыстаў на практычнай рабоце. Гэта сведчыць аб тым, што трэба перабудаваць каляндарныя планы вучобы.

Другое пытанне, якому ўсе выступаўшыя таварышы аддалі вялікую ўвагу —гэта **вучоба актыву.** Чыстка партыі, побач з прарывамі ў тэарытычнай вучобе, паказала, што ідэйна-палітычны ўзровень комуністаў значна вырас. Гэта вельмі яркі відаць і па рэзультатах камплектавання партыйных школ. Лік слухачоў комуністаў у гэтым годзе значна вышэйшы, чым у мінулым. Узмацнілася цяга да вучобы. Але ўжо цяпер ёсць небяспека, калі работа комуністаў будзе не даволі добра арганізавана з самага пачатку, вучоба актыва будзе правалена. Трэба ва што-б тым ні стала дабіцца, каб тры дні штомесячна актыў поўнасцю вызваляўся для вучобы, гэтыя дні вучобы павінны дакладна падрыхтоўвацца і культпропамі і самымі слухачамі.

Большасць выступаўшых на нарадзе таварышоў зусім правільна заастралі ўвагу на «дробязях» арганізацыйнага парадка. У значнай частцы раёнаў яшчэ няма падручнікаў, спазніліся праграмы, не падрыхтаваны памяшканні. Гэта з'яўляецца сур'ёзнай небяспекай, бо калі цяпер, дзякуючы парадуальнаму дрэнна праведзенаму камплектаванню, лічбы ахопа партвучобай здаваліся б, то пасля першых зрываў пачнецца вялікая цякучасць.

Неадкладна спазнідаваць усялякія тормазы на шляху нармальнай вучобы — такая задача сёнешняга дня.

У мінулым навучальным годзе на ўсёй партыйнай сетцы мела месца вельмі вялікая цякучасць слухачоў. Культпроп Барысаўскага РК КП(б)Б т. **Баяркоў** перадаў нарадзе каштоўны вопыт барацьбы з гэтай цякучасцю: «Мы праводзім такія мерапрыемствы, як спецыяльныя канферэнцыі зрыўшчыкаў. Гэта мерапрыемства дае магчымасць дакладна ведаць прычыны цякучасці. Па лініі друку мы пералаем тым, якія перапулярна навядваюць школы, сігнальныя лісткі. Заводы «Комінтэрн» і імя Домбаля ў рэзультаце гэтых мерапрыемстваў маюць добрыя рэзультаты. Тыя, якія раней мелі шмат адпускаў, сталі акуратна наведваць школу». Гэты вопыт барысаўскага райкома павінен ужывацца ва ўсіх партыйных арганізацыях.

На нарадзе выступіў культпроп ЦК ЛКСМБ т. **Ажгірэй,** які спецыяльна за вастрыў увагу на партыйным кіраўніцтве комсамольскай вучобай. Тав. Ажгірэй прыводзіў агідненькія факты адмаховаты ад «лікучых комсамольцаў». Культпропы многіх раёнаў не лічаць сваім абавязкам нават цікавіцца станам комсамольскай палітвучобы. Між тым чыстка партыі выявіла, што процант палітычна неграмотных і малапісьменных сярод партыйцаў-комсамольцаў недапушчальна вялікі. Гэта вельмі пераканаўча гаворыць аб неабходнасці неадкладна аказаць дапамогу райкомам комсамола ў арганізацыі вучобы, аб необходнасці дапамагчы прапагандыстыкі кадрамі, матэрыяльнымі сродкамі і інш. Райкомы партыі не менш, а больш, чым райкомы комсамола адказваюць за марксіцка-ленінскае выхаванне маладога пакалення.

У дзень працавалі секцыі, якія прапрацавалі рэзалюцыю і больш падрабязна абмяняліся вопытам сваёй работы.

На культпропнарадзе з прамовай выступіў сакратар ЦК КП(б)Б т. **Жбароўскі.**

Лепшай партарганізацыі па пастаноўцы марксіцка-ленінскай вучобы--сцяг „Звязды"

На сённяшнім пасяджэнні ўсебеларускай культпропнарады з прамовай выступіў рэдактар «Звязды» т. **Брагінскі.**

— Наша сістэма партыйнай асветы, — гаворыць тав. Брагінскі, — пачала ў гэтым годзе работу ва ўмовах, якія глыбока адрозніваюцца ад ранейшых гадоў. Чыстка партыі паказала велізарны ідэйна-палітычны рост партыі ў цэлым. Без гэтага роста ідэйнага і арганізацыйнага здзіўства нашай партыі не былі-б магчымы тыя велізарнейшыя, рашаючыя перамогі, якія мы маем па ўсім фронце соцыялістычнага будаўніцтва. Але разам з тым чыстка партыі ўскрыла, што ў радах нашай партыі мы маем шмат значныя пласты, якія не авоілі асноў праграмы, арганізацыі і тактыкі нашай партыі.

Чыстка партыі глобач з гэтым ўскрыла і велізарную цягу членаў партыі да партыйнай асветы. Мы ніколі раней не бачылі такога імкнення да вывучэння праграмы і статута партыі, як перад чысткай і ў перыяд самой чысткі. **Задача заключаецца ў тым, каб гэты велізарнейшы зрух у свядомасці маладых членаў партыі, гэту велізарнейшую цягу да партыйнай асветы, да партыйнай пісьменнасці, да павышэння свайго тэарытычнага і палітычнага ўзроўня — не толькі замацаваць, але і развіць далей.**

Вы ведаеце, якое значэнне партыя адразу надае справе павышэння ідэйна - палітычнага ўзроўня партыйнай масы. У інструкцыі ЦК і ЦКК па чыстцы даволі выпукла падкрэслена, што адной з асноўных задач чысткі партыі з'яўляецца павышэнне ідэйна-палітычнага ўзроўня ўсіх членаў партыі.

Бо зусім-жа зразумела, што ў тых умовах, у якіх нам прыходзіцца змагацца і працаваць, ва ўмовах, калі няма ні адной галіны, няма ні аднаго вузла гаспадарчага і палітычнага жыцця, якім бы партыя непасрэдна не кіравала, пры гэтай умове неабходнасць узнімання ідэйна-палітычнага ўзроўня партыйнай масы з'яўляецца адной з важнейшых і рашаючых задач. Хіба можна гаварыць аб авангардній ролі комуніста на прадпрыемстве, ў калгасе, калі гэты комуніст не ведае асноўных прынцыпаў нашай партыі, не ведае праграмы, не ведае статута нашай партыі? Задача кожнага члена партыі ўсюды, куды-б яго партыя быў ударнікам парт вучобы. Мы будзем вымяраць актыўнасць кожнага члена партыі не толькі тым, як ён выконвае сваю вытворчую праграму, але і тым, як ён узбройвае сябе марксіцка-ленінскай тэорыяй, як ён прыстасоўвае гэту тэорыю ў сваёй штодзённай рабоце.

Наша сістэма партыйнай асветы, — гаворыць тав. Брагінскі, — пачала ў гэтым годзе работу ва ўмовах, якія глыбока адрозніваюцца ад ранейшых гадоў. Чыстка партыі паказала велізарны ідэйна-палітычны рост партыі ў цэлым. Без гэтага роста ідэйнага і арганізацыйнага здзіўства нашай партыі не былі-б магчымы тыя велізарнейшыя, рашаючыя перамогі, якія мы маем па ўсім фронце соцыялістычнага будаўніцтва. Але разам з тым чыстка партыі ўскрыла, што ў радах нашай партыі мы маем шмат значныя пласты, якія не авоілі асноў праграмы, арганізацыі і тактыкі нашай партыі.

Чыстка партыі глобач з гэтым ўскрыла і велізарную цягу членаў партыі да партыйнай асветы. Мы ніколі раней не бачылі такога імкнення да вывучэння праграмы і статута партыі, як перад чысткай і ў перыяд самой чысткі. **Задача заключаецца ў тым, каб гэты велізарнейшы зрух у свядомасці маладых членаў партыі, гэту велізарнейшую цягу да партыйнай асветы, да партыйнай пісьменнасці, да павышэння свайго тэарытычнага і палітычнага ўзроўня — не толькі замацаваць, але і развіць далей.**

Вы ведаеце, якое значэнне партыя адразу надае справе павышэння ідэйна - палітычнага ўзроўня партыйнай масы. У інструкцыі ЦК і ЦКК па чыстцы даволі выпукла падкрэслена, што адной з асноўных задач чысткі партыі з'яўляецца павышэнне ідэйна-палітычнага ўзроўня ўсіх членаў партыі.

Бо зусім-жа зразумела, што ў тых умовах, у якіх нам прыходзіцца змагацца і працаваць, ва ўмовах, калі няма ні адной галіны, няма ні аднаго вузла гаспадарчага і палітычнага жыцця, якім бы партыя непасрэдна не кіравала, пры гэтай умове неабходнасць узнімання ідэйна-палітычнага ўзроўня партыйнай масы з'яўляецца адной з важнейшых і рашаючых задач. Хіба можна гаварыць аб авангардній ролі комуніста на прадпрыемстве, ў калгасе, калі гэты комуніст не ведае асноўных прынцыпаў нашай партыі, не ведае праграмы, не ведае статута нашай партыі? Задача кожнага члена партыі ўсюды, куды-б яго партыя быў ударнікам парт вучобы. Мы будзем вымяраць актыўнасць кожнага члена партыі не толькі тым, як ён выконвае сваю вытворчую праграму, але і тым, як ён узбройвае сябе марксіцка-ленінскай тэорыяй, як ён прыстасоўвае гэту тэорыю ў сваёй штодзённай рабоце.

Сцяг ЦК ЛКСМБ

ХЕЙФЕЦ

ЗАГ. КУЛЬТПРОПАМ МЕНСКАГА ГАРКОМА.

Ахапіць вучобай не менш 8.000 комуністаў

У адным з пунктаў дагавора паміж Менскам, Віцебскам і Гомелем запісана: «Надыходзячы год партыйнай вучобы павінен стаць годам сапраўднай штодзённай марксіцка-ленінскай падрыхтоўкі усіх комуністаў, годам упартай большэвіцкай барацьбы за палітычны рост кожнага партыйца, кожнай парт'ячэйкі, за сапраўднае ўзбраенне марксіцка-ленінскай тэорыяй кожнага комуніста, комсамольца і пераданіка рабочага. Не павінна быць ні аднаго комуніста, неахопленага партвучобай».

Галоўнае — непасрэднае кіраўніцтва, уваходжанне ва ўсе дробязі партыйнай вучобы — ведаць як вучаюць, хто вучыць, як пасціжаюць слухачы, як увязваецца марксіцка-ленінская вучоба з агульнай барацьбой за выкананне чарговых задач. У гэтых адносінах тое спаборніцтва, якое разгорнецца паміж **Менскам, Гомелем і Віцебскам,** тое спаборніцтва, якое будзе разгорнута зараз за тое, каб апрымаць сцяг ЦО нашай партыі **«Звязды»** — у значнай меры да паможа нам больш аперацыйна сачыць за гэтым важнейшым участкам нашай работы.

Мы паставілі перад сабой задачу — ахапіць у гэтым годзе партвучобай 8.000 комуністаў і не менш 2.000 перадавых рабочых. За гэту справу мы будзем змагацца так, як змагаемся за выкананне іншых важнейшых задач, што стаяць перад менскай партарганізацыяй.

Як сталічная партарганізацыя, мы ставім перад сабой задачу — дапамагчы вёсцы наладзіць партвучобу. Лепшыя партыйныя кадры, прайшоўшыя школу марксіцкай вучобы, у гэтым годзе будуць кінуты ў вёску.

Мы ставім сабе задачай, каб кожны ўдарнік вытворчасці быў ударнікам парт вучобы. Мы будзем вымяраць актыўнасць кожнага члена партыі не толькі тым, як ён выконвае сваю вытворчую праграму, але і тым, як ён узбройвае сябе марксіцка-ленінскай тэорыяй, як ён прыстасоўвае гэту тэорыю ў сваёй штодзённай рабоце.

ЯЦКЕВІЧ

ЗАГ. КУЛЬТПРОПАМ Гомельскага гаркома

Абавязацельствы ператварыць ў канкрэтныя справы

Мы ставім сабе задачу, каб умовы соцспаборніцтва былі ўмовамі, мабілізуючымі не толькі лапы партуркі, але і ўсю нашу парторганізацыю на выкананне тых абавязацельстваў, якія мы на сябе ўзялі, каб апрымаць сцяг **«Звязды».** Наша задача заключаецца ў тым, каб нашы пастановы і нашы абяцанні ператварыць у канкрэтныя справы. Гомельская партыйная арганізацыя шляхам соцспаборніцтва будзе змагацца за тое, каб узняцца на вышэйшую ступень марксіцка-ленінскую вучобу.

БАЯКОЎ

ЗАГ. КУЛЬТПРОПАМ БАРЫСАЎСКАГА РАЙКОМА

Павысіць партасвету метадам соцспаборніцтва

Барысаўская, магілеўская і аршанская дэлегацыі афармілі дагавор на соцспаборніцтва. Тое, аб чым гаварыў рэдактар **«Звязды»,** тав. **Брагінскі,** датычыць непасрэдна ўсіх нас, прысутных на нарадзе. Задача заключаецца ў тым, каб метады соцыялістычнага спаборніцтва, метады ўдарніцтва, якія знайшлі велізарнае распаўсюджанне ва ўсіх участках соцыялістычнага будаўніцтва, каб яны сталі здабыткам і такога важнейшага участка соцыялістычнага будаўніцтва, як партыйная асвета. Праўда, соцспаборніцтва ў нас разгорнецца не толькі зараз, яно ў нас было і раней. Але трэба сказаць, што яно не дасягнула таго размаху, які нам патрэбен быў. Соцспаборніцтва ў мінулым годзе не выходзіла з рамак асобных школ. Не было спаборніцтва паміж асобнымі арганізацыямі, не ідзейчы на тое, што на раду гаспадарчых пытанняў мы такое спаборніцтва маем.

Заключаючы дагавор паміж гэтымі трыма арганізацыямі, мы паклалі ў аснову налажэнне тав. Сталіна: «Дагаляй лепшых і дойдзе агульнага ўздыма».

Мы павінны так паставіць спаборніцтва, каб быў агульны ўздым і, каб усе арганізацыі выйшлі ў перадавыя рады, каб не было адстаючых. ЦО КП(б)Б **«Звязда»** ўстанаўлае пераходны сцяг. Аўладаць гэтым сцягам з'яўляецца гонарам кожнай партыйнай арганізацыі. Гэта абавязвае нас удзесяцярыць нашы сілы ў барацьбе за марксіцка-ленінскае выхаванне членаў партыі. Дагавор, які заключан паміж барысаўскай, магілеўскай і аршанскай арганізацыямі, мы без трэскаціні, а штодзённа, пункт за пунктам будзем выконваць. Мы ў гэтай аршанскай партарганізацыі ў гэтым годзе так наладзім справу падрыхтоўкі вучобы, каб апрымаць сцяг «Звязды».

ЗІНОЎЕЎ

ЗАГ. КУЛЬТПРОПАМ ВІЦЕБСКАГА ГАРКОМА

Партасвета—справа ўсёй партарганізацыі

Віцебская партыйная арганізацыя раённа заключыць соцыялістычны дагавор на лепшую арганізацыю партвучобы паміж **віцебскай, менскай і гомельскай** партарганізацыямі. Гэтым дагаворам, як і дагаворам па гаспадарчых пытаннях, заключаным паміж гэтымі партарганізацыямі, мы ставім задачу вывесці віцебскую партарганізацыю ў перадавыя рады КП(б)Б.

Гэтыя тры партарганізацыі ў аснову свайго дагавора паклалі задачу — поўнасцю ахапіць комуністаў, кандыдатаў і спачуваючых розныя формамі партыйнай вучобы, павысіць якасць сваёй вучобы і зрабіць справу партасветы справай усёй партыйнай арганізацыі.

Мы цвёрда ўпэўнены, што соцдагавор, які мы заключаем, зробіць пералом у работе па аўладанні тэорыяй Маркса-Ленина-Сталіна.

ЛЕВІТ

ЗАГ. КУЛЬТПРОПАМ МАГІЛЕЎСКАГА РАЙКОМА.

З гонарам выканаем узятыя абавязкі

ЦК партыі паставіў перад магілеўскай арганізацыяй гаварову і вялікую задачу — ператварыць Магілеўскі раён у адзін з вядучых раёнаў Беларусі. Суставной часткай нашай работы па ператварэнні Магілеўскага раёна ў вядучы з'яўляецца большэвіцкая барацьба за разгортванне марксіцка-ленінскай вучобы. Сёння мы заключылі соцдагавор з барысаўскай і аршанскай партарганізацыямі. Трэба сказаць, што на сённяшні дзень з марксіцка-ленінскай вучобай у Барысаве справа стаіць лепш, чым у нас. Мы гэта ведаем добра. Але заключаючы соцдагавор, бручы на сябе рад абавязкаў, мы не забываем, што перад намі стаяць адказнейшыя задачы. Ад імя магілеўскай дэлегацыі я запэўніваю ЦК КП(б)Б і «Звязду», што ўзятыя на сябе абавязкі мы з гонарам выканаем.

ЗРОБІМ ПУЦЯВУЮ ГАСПАДАРКУ УЗОРНАЙ

На прыкладу рабочых і ІТР 8-й дыстанцыі прымайце шэфства над асобнымі пуцямі, кіламетрамі, стрэлкамі

Да ўсіх рабочых і інжынерна-тэхнічных работнікаў службы пуці БССР

ЦК УсеКП(б) і СНК СССР у сваіх гістарычных пастановах далі, разгорнутую праграму перабудовы работы ўсіх галін чыгуначнага транспарта. Аднак перабудова праходзіць невыстарчальнымі тэмпамі. Сабатажнікі, прыхільнікі абанкутаваўшых канцылярска-бюракратычных метадаў кіраўніцтва супраціўляюцца рэалізацыі пастаноў партыі і ўрада, арыгінальна выканаўшы планаў перавозак, запрымліваюць тэмпы ўзнімання работы транспарта на ўзровень задач другой пяцігодкі.

Пуцявая гаспадарка з'яўляецца адной з найбольш адсталых галін чыгуначнага транспарта.

У пастанове ЦК УсеКП(б) аб рабоце Екацярынінскай і Курскай чыгунак з усёй выразнасцю падкрэслена значная запушчанасць пуцявой гаспадаркі. Гэта ўказанне датычыць рада чыгунак і ў прыватнасці чыгунак БССР.

Да гэтага часу пуць не карыстаўся той увагай, якую ён заслугоўвае. Рамонт і ўтрымаанне яго праводзіцца нездавальняюча.

Між тым у сувязі з велізарнейшым ростам грузазварота, які абумаўляецца бурным ростам соцыялістычнага будаўніцтва, пуць адрымаў павялічаную нагрузку. Гэта патрабуе палепшэння яго тэхнічнага стана і асабліва прывядзення ва ўзорны выгляд шпальнай гаспадаркі, баластэ і палатна.

Наша 8-я дыстанцыя МБВ чыг. (Менск) не з'яўляецца выключэннем. Пуцявая гаспадарка і ў нас знаходзіцца яшчэ ў запушчаным стаўленні. Праўда, за апошні час над кіраўніцтвам палітаддзела раёна мы дабіліся некаторых зрухаў у рабоце.

Што мы зрабілі для падрыхтоўкі пуці да асенняй-зімовых перавозак?

Пасля пастановы ЦК і СНК мы асаблівую ўвагу звярнулі на правільную расстаноўку вытворчых і партыйных сіл, на ўзмацненне нізавога вытворчага звяна-акалодка. Для гэтай мэты мы пасунулі непасрэдна на вытворчасць наступных таварышоў: памочніка начальніка дыстанцыі тав. **Кавалёва** прызначылі дарожным майстрам, старэйшага дарожнага майстра **Наумаўца** — дарожным майстрам, намесніка прараба **Сіпілова** —памочнікам дарожнага майстра, кіраўніка дамамі, тэхніка **Талюка** — памочнікам дарожнага майстра, тэхніка дыстанцыі **Скуратовіча** — памочнікам дарожнага майстра.

Перасоўка ІТР, разгортванне соцспаборніцтва ў спалучэнні з умелай пастаноўкай масавай работы забяспечылі шэфны пералом у выкананні трамфінплана 3-га квартала. Па змене шпал на станцыйных пуцях план выкананы на 349 проц., па змене маставога брусся—на 100 проц., папраўленне пуці баластам—на 103 проц., на змене пуцявога і стрэлачнага стрэлачаны—на 133 проц., па суцэльным стрэлачным рамонце — на 106,6 проц. Закончаны работы па змене шпал на галоўных пуцях і па капітальным рамонце. Значна, узнялася прадукцыйнасць працы — у сярэднім па дыстанцыі на 41 проц. пры росце зарплаты на 30 проц.

Дыстанцыя шмат увагі аддала мабілізацыі ўкутраных рэсурсаў і ўтылізацыі ўсялякіх адыходаў. Так, процэнтны выраблёнца з металалома. Раней-жа для гэтай мэты выпісвалася гатунковае жалеза. Майстэрні па 80 проц. працуюць на утылізадыходах. Арганізаваны рамонт буйных стрэлачных частак крыжавін, раменных рэек у той час, як раней гэтыя часткі выпісваліся з завода. Балты для стрэлак вырабляюцца са старых непрыгодных балтоў.

Падрыхтоўка да снегабарацьбы па дыстанцыі ў гэтым годзе пачата значна раней. Два снегаачышчальнікі для галоўных і станцыйных пуцей нанова адрамантаваны. Прыведзена таксама ў парадак 70 проц. патрэбнай колькасці снегавых шчытоў. Вылучаны і ў бліжэйшыя дні выедуць на месца вярбоўшчыкі для заключэння дагавораў з калгасамі на рабочую сілу. Для вярбоўкі замацаваны два раёны. Будуецца барак на 40 чалавек і калгасцы рамонт аднаго сталага інтэрната.

Паводле загала тав. Андрэева начальнікі дыстанцый упершыню асабіста прымаюць работы па акалодках. Ужо апледжаны і прыняты работы па 3 акалодках.

Зараз па ініцыятыве начальніка палітаддзела раёна т. **Кірылава** створаны брыгады для грамадскай узаемаправеркі станцыйна пуцей па акалодках. З 15 кастрычніка брыгады прыступілі да работы. Складзен графік, які прадугледжвае скалачэнне гэтай праверкі да 1 лістапада. Брыгады павінны абыйсці ўсю дыстанцыю, выявіць дэфекты з тым, каб іх ліквідаваць да наступлення халадоў.

Трэба з усёй большэвіцкай адкрытасцю заявіць, што ў рабоце нашай дыстанцыі ёсць яшчэ буйнейшыя недахопы, асабліва ў выкананні якасных паказальнікаў і плана новага будаўніцтва.

Пры аглядзе трох акалодкаў выкрыт рад дэфектаў на земляным палатне, баластнаму пласту, па ўкладцы шпал і спрыльенных. Асабліва шмат дэфектаў у першым акалодку (дарожны майстра **Капільян).** Шпалы пастаўлены тут не па сваіх восях, не шчыльна яны падбіты, напрамак рэйкавых ніцей загвазвідны, што выклікае неспакойны ход цягніка, шмат асабліва балтоў і інш.

Некаторыя рабочыя дыстанцыі надоб расумленна адносяцца да сваіх абавязкаў, неахайна ўтрымліваюць стрэлкі і шядобраякасна падрыхтоўваюць матэрыялы і часткі для рамонта гэтых стрэлак. Майстэрні дыстанцыі па віне слесара **Звенчыка** выпусцілі 40 балтоў для рамонта стрэлак, якія аказаліся непрыгоднымі. У брыгадзіра **Бачышча** стрэлкі ў найгоршым становішчы.

Набліжаецца XVI гадавіна вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі. Да гэтага свята мы павінны рашучым чынам палепшыць сваю работу, ліквідаваць усе недахопы.

Сярод нас асобныя рабочыя брыгады ўжо разгарнулі соцспаборніцтва на дэтэрміноване і высокаякаснае выкананне вымяральнікаў. Пачын зрабіла 19-я брыгада т. **Валодзька** з 5 акалодка, якая абавязалася датэрмінова да XVI гадавіны Кастрычніка ў лік 4-га квартала змяніць на станцыйных пуцях 300 шпал, адрамантаваць буйным рамонтам 9 клм. пуцей і 75 стрэлак, не дапусціць ні аднаго парушэння дысцыплінарнага статута. Яе прыкладу паследавалі 21, 18 і 15 брыгады.

Мы, рабочыя і ІТР 8-й дыстанцыі, уключаемся ў спаборніцтва за большэвіцкую сустрэчу XVI Кастрычніка і прымаем шэфства над асобнымі стрэлкамі і кіламетрамі.

Мы абавязуемся ў парадку шэфства праводзіць не менш аднаго раза ў дэкаду агляд пуцей, стрэлак, прымаць непасрэдны ўдзел у ліквідацыі выкрытых дэфектаў, у своечасовым забеспячэнні работ неабходнымі матэрыяламі і часткамі.

Рабочыя-рамонтнікі 5-та акалодка — **Осіпаў, Кобяк, Багданаў, Васілюк** прынялі ўжо шэфства над 160 стрэлкамі сваіх участкаў, абавязаліся поўнасцю адрамантаваць іх да 25 кастрычніка і ў далейшым утрымліваць іх так, як патрабуюць тэхнічныя правілы. Рабочы гэтага-ж акалодка **Метэчка** ў парадку шэфства над прыкутнікам да паваротта паравоза на Менскай таварнай абавязаўся ў трохдзённы тэрмін выявіць недахопы на шаблону і ўзроўні, ліквідаваць усе дробныя недахопы да 20 кастрычніка і ў далейшым регулярна, не менш раза ў пяцідзённку правяраць становішча пуці. Рамонтнік **Руды** шэфствуе над трэкцыйнымі пуцямі Менск-таварная і штодзённа асабіста правярае кожны пуць. Рабочыя **Рэмюс, Крэсік і** пуцявыя аглядчыкі **Маляўка і Моцкус** прынялі шэфства над 754, 755 756 і 757 кіламетрамі галоўных пуцей і абавязаліся ў трохдзённы тэрмін выявіць усе тэхнічныя недахопы, ліквідаваць іх і ў далейшым дакладна правяраць становішча кожнага падшэфнага кіламетра не менш двух раз у пяцідзённку. Так разгортваецца ў нас новы від прамадскай дапамогі пуцявой гаспадарцы.

Каб улічваць як самаабавязкі будуць ператвараца ў канкрэтныя справы, мы арганізуем ва ўсіх акалодках узаемную самаправерку.

Заклікаем усіх пуцейцаў БССР паследаваць нашаму прыкладу, уключыцца ў бой за стварэнне на совецкіх чыгунках узорнай пуцявой гаспадаркі. Разгорнем масавае шэфства раментнікаў і ІТР над кожным кіламетрам пуці. Няхай кожная стрэлка, кожны кіламетр пуці мае свайго шэфа.

На аснове рашучай барацьбы з сабатажам пастаноў СНК і ЦК, на аснове жалезнай свядомай дысцыпліны, шырокага разгортвання соцспаборніцтва і ўдарніцтва **забяспечым да XVI гадавіны Кастрычніка поўную ліквідацыю на дахопаў у пуцявой гаспадарцы і поўную падрыхтаванасць яе да зімы.**

Ад імя рабочых і ІТР 8-й дыстанцыі
Начальнік 8-й дыстанцыі ШАРЫМАНАЎ, сакратар парткалектыва КАЖДАН, старшыня МК КОРЗУН, загадчык майстэрнямі ПЕТРАКОЎ, старшы брыгадзір каваль 6-га акалодка МІСЮКЕВІЧ, нам. начальніка дыстанцыі — інжынер ШАЛІМА, памочнік дарожнага майстра ТАЛЮК.

Старыя кадравікі-рабочыя:
СІПЛОЎ, КОБЯК, БАГДАНАЎ, ВАСІЛЮК, РУДЫ, МЕТЭЧКА, ВАЛОДЗЬКА, ПАДКОВІЧ, дарожны майстра ТАЛЮК; брыгадзіры: МАЛАШКА, ШЫМКО, СЕРМЯЖКА; рамонтнікі: РЭМЮС, КРЭСІК; пуцявыя аглядчыкі: МАЛЯЎКА, МОЦКУС.

Тав. МАЛАШКА — лепшы брыгадзір пуці 15 брыгады.

УСЕБЕЛАРУСКАЯ ПЕРАДКАСТРЫЧНІЦКАЯ ВЫТВОРЧАЯ ПЕРАКЛІЧКА

НА ФАБРЫЦЫ „ДУБРОВЕНСКАЯ МАНУФАКТУРА" ВАРШТАТЫ ЗАГРУЖАНЫ на ПАЛОВУ

Поўнасцю загрузіць рабочы дзень, арганізуем глыбокі сістэматычны тэхнічны інструктаж рабочых

Нормы не даведзены да рабочага

ДУБРОЎНА. (Наш кар.).

Тэхдырэктар «Дняпроўскай мануфактуры» т. **Баўшвер** можа без канца і з захапленнем расказваць аб тым, якая вялікая работа праведзена на фабрыцы па тэхнічным нармаванні. Адчуваеш, што чалавек усю сваю энергію аддае для таго, каб аўладаць складанасцю вытворчых працэсаў фабрыкі, кожнага варштата, надаць ім планавасць і стройнасць.

У пачатку бягучага года патрачана нямала часу на хранометражныя работы, на вывучэнне каэфіцыента карыснага дзеяння кожнага вагара, кожнай шасцярэнкі. Асноўныя пэхі — ткацкі і матальны — пераведзены на здзельнічыну.

Такім чынам, як быццам, усё ў парадку.

Але гэта зусім не так. Калі за ліпень і жнівень трамфінплан фабрыкі быў выкананы на **76** проц., то ў верасні гэта лічба знізілася да **69.**

Далёка нездавальняючыя паказальнікі і па якасці. Надыходзім да бракавальнага варштата. Бракаўшчык **Аклер** правярае кавалак каля **100** метраў трыко. Аказваецца матэрыял увесь на зломах, фарба ўзялася палосамі. Брак. А хто ў гэтым вінаваты? — Невядома: ні то **Дзяшыц,** ні то **Дзяшыц.**

Такім чынам, дакладныя вылічэнні каэфіцыентаў ёсць, ёсць і здзельнічына, а трамфінплан выконваецца толькі на **69** проц. Чаму?

Па-першае, таму, што значная частка ткацкіх варштатаў не працуе. Няма патрэбнай колькасці рабочых. На гэта спасылаюцца ўсе, але ніхто не падумае аб тым, каб спусціцца ў калгасы і арганізавана завербаваць рабочых. У рэзультаце 20-30 проц. прастою выключна з-за недахопа рабочай сілы.

Характэрна, што кіраўнікі фабрыкі не хочуць прымаць пад увагу другой, не менш важнай прычыны адставання: нізкай прадукцыйнасці працы. На фабрыцы значная частка варштатаў выпрацоўвае толькі **50-60** проц. нормы.

Такі недапушчальна нізкі процант тлумачыцца перш за ўсё тым, што «дакладна» распрацаваныя ў кабінетах нормы і ўкновы здзельнічыны не даведзены да рабочых, а калі і «даведзены», то такім парадкам:

— Вось табе норма, калі ласка выканай яе.

Аб тым, каб рабочы павысіў сваю кваліфікацыю, каб ён свядома ўспрыняў нормы, каб ён сам прыняў удзел у вызначэнні гэтых норм — аб гэтым ні партыйная арганізацыя, ні фабком не думаюць. І невыпадкова, што рабочыя матальнага цэха часта «атакуюць» старшыню фабкома тав. **Левіна:**

— Растлумачце нам, чаму ў нас такія нормы, і як іх выканаць?

Тэхнічная неінфармаванасць рабочых і асабліва падмайстраў — асноўны недахоп у рабоце фабрыкі. Падмайстра тав. **Чапялоў** з аганьком у вачах успамінае пра курсы тэхмінімума. Ён расказвае, як гэтыя курсы дапамаглі яму, практыку, асвоіць пораў машын, узняць процант выканання плана...

Успамінае... Курсы такія былі. Іх наведвала звыш 400 чалавек. Многія вучыліся з вялікай ахвотай. Але курсаў больш няма. У сувязі з убогачнай на прытарадній гаспадарцы курсы закрылі...

Што-ж робіць бюро парткалектыва для таго, каб ліквідаваць усе гэтыя непаладкі?

— Канстатуе факты. Не больш.

Сакратар бюро парткалектыва тав. **Грын** хваліцца тым, што ён арганізаваў партгрупы, вылучыў партарганізатараў, што амаль усе комуністы ўдарнікі, што партгрупорг **Рабіновіч** выконвае трамфінплан...

А яго група, а змена, якую абслугоўвае партгрупа Рабіновіча? Яна не выконвае трамфінплана. Аказваецца, партгрупы існуюць толькі на паперы. Яны нават не лічаць патрэбным праводзіць такую работу, як кароткія вытворчыя нарады ў сваёй змене:

— Гэта — справа адміністрацыі, — кажа т. Грын.

Вось у чым асноўныя прычыны адставання фабрыкі. Іх павінны ўлічыць кіраўнікі «Дняпроўскай мануфактуры» і забяспечыць добрую работу ўсіх цэхаў і варштатаў.

І яшчэ адна заўвага па адрасу Нарэмлёгпрама: даволі карміць фабрыку абяцанкамі, трэба ёй даць кваліфікаваных спецыялістаў, бо яна мае толькі аднаго інжынера-тэкстыльшчыка.

Віт. Даль.

Пераходны сцяг у надзейных руках

У першай палове трыццаць другога года віцебскі фанерны завод ганебна адставаў. У другім паўгоддзі заводскія арганізацыі пачынаюць перабудоўваць сваю работу, пераносячы яе ў цэх, брыгаду. Кожнаму рабочаму даводзіцца тэхнічна ўпрунтаваная норма. Заводскія арганізацыі наладзілі штодзённую праверку таго, што зроблена стайстрамі, цэхавымі партыйнымі ячэйкамі, прафсаюзнымі камітэтамі ў справе ліквідацыі ўраўнілаўкі ў зарплаце. Апошняя сцірала ўсякую розніцу паміж добрай і дрэннай работай, паміж кваліфікаванай і некваліфікаванай работай.

Машыны, варштаты ўпершыню атрымалі права мець пастаянага гаспадара. Абязлічка была знішчана. Інакш пайшла праца ў цэхах. Крывая выканання трамфінплана крута ўзялася ўверх. Мінулы год быў закончан выкананнем вытворчай праграмы на **100,5 проц.** Завод за перамогі атрымлівае пераходны сцяг ЦК ЛКСМБ.

Уступаючы ў першы год другой пяцігодкі, заводскія арганізацыі, рабочыя паставілі перад сабой задачу ва што-б там ні стала ўтрымаць пераходны сцяг комсамола. Пачалі з падрыхтоўкі кадраў. Інжынерна-тэхнічныя работнікі бяруць шэфства над гаспадарча-разрахункавымі брыгадамі. Стварацца курсы па падрыхтоўцы брыгадзіраў. **118** чалавек атрымліваюць перакваліфікацыю і пастаўлены на адказныя ўчасткі вытворчай работы.

На заводзе налічваецца 33 гаспадарча-разрахункавыя брыгады. Інжынеры і тэхнікі дапамагаюць брыгадам у наладжванні ўліка, у пашпартызацыі варштатаў. Асабліва трэба адзначыць непасрэдную дапамогу інжынера **Шэйніна** і эканамічка ТНБ **Голубева** — гаспадарча - разрахункавым брыгадам, якія за 8 месяцаў бягучага года мелі **27.000** рублёў эканоміі на дапаможных

ЛІСТОК ЦКК-НК РСІ

КЛОПАТЫ АБ ДАЛЕЙШЫМ ПАЛЯПШЭННІ МАТЭРЫЯЛЬНА-БЫТАВОГА СТАНОВІШЧА РАБОЧЫХ—ГАНАРОВЫ АБАВЯЗАК БОЛЬШЭВІКА

ПЕРАМАГЧЫ БЮРАКРАТЫЧНАЕ ІГНАРАВАННЕ І ПАНСКІЯ ПАГАРДЛІВЫЯ АДНОСІНЫ ДА РАБОЧАГА СНАБЖЭННЯ

РАБОТУ ЗРК І ОРС'аў—НА ПЕРШЫ ПЛАН!

Велізарны рост таварных мас у краіне, карэнная перабудова сістэмы рабочага забеспячэння стварылі ўсе ўмовы для далейшага паляпшэння снабжэння працоўных.

Там, дзе заводскія арганізацыі аддалі патрэбную ўвагу рабоце ЗРК, Орс'аў, сталовак і прыгарадных гаспадарак, як важнейшым цэхам прадпрыемства, там рабочае снабжэнне стала магутным фактарам барацьбы за прамфінплан, за большэвіцкую дысцыпліну на вытворчасці, там лепшыя ўдарнікі на справе адчулі дапамогу і клопаты аб іх.

Сёння мы змяшчаем лісток ЦКК-НК, прысвечаны рабочаму снабжэнню. Мы ў гэтым лістку выкрываецца рад [illegible] злачынных адносін да рабочага [illegible]ня. Яскравы прыклад — ДРЭВААПРАЦОЎЧЫ КАМБІНАТ ІМЯ [illegible]ГІКАЛО. Там заводскія арганізацыі [illegible]К не толькі не забяспечылі паравзжнага снабжэння лепшых ударнікаў, але наогул сарвалі ўсю работу. З рук вон дрэнна працуе заводская сталоўка. Зусім не разгорнуты дэцэнтралізаваныя загатоўкі. Крамы ЗРК гандлююць толькі тымі таварамі, якія атрымліваюцца ў цэнтралізаваным парадку. Злачынная безгаспадарчасць давяла каапгас да заняпаду.

Матэрыялы аб рабоце ЗРК «Чырвоны металіст» у Віцебску і швэйнікаў у Бабруйску таксама паказваюць, што многія заводскія арганізацыі не ўсвядомілі ўсяго значэння рабочага снабжэння як важнейшага фактара пасляховай барацьбы за прамфінплан, лічаць работу ЗРК «другарадняй» справай.

Гэтыя матэрыялы — сур'ёзны сігнал, сур'ёзнае папярэджанне ўсім нашым арганізацыям.

Паляпшэнне рабочага снабжэння павінна стаць адной з цэнтральных задач заводскіх арганізацый. Гэта справа не аднаго толькі ЗРК, але кожнай заводскай, гаспадарчай, партыйнай і прафесіянальнай арганізацыі. Ігнараванне гэтай важнейшай работы прыводзіць да прарываў на вытворчасці.

Няўхільнае павышэнне якасці попыта рабочага спажыўца настойліва патрабуе УДАСКАНАЛЕННЯ ТЭХНІЧНАЙ БАЗЫ ГАНДЛЯ, ператварэння кожнай заводской крамы ў прадпрыемства сапраўды культурнага совецкага гандля. Іменна зараз, калі з асоблівай сілай дае сябе адчуваць уздым дабрабыту рабочых мас, барацьба за высокую якасць і рознастайны асартымент тавараў набывае рашаючае значэнне.

Адна з важнейшых умоў культурнага гандля—гэта РАЗВІЦЦЁ САМАЗАГАТОВАК. Правільна арганізаваць самазагатоўкі—значыць купляць тое, што сапраўды патрэбна спажыўцу, купляць тавар высокай якасці па даступнай цане. Абмежаваць увесь гандаль продажам планумых тавараў, значыць вярнуцца к старым, асуджаным метадам механічнага размеркавання.

Трэба скарыстаць усе мясцовыя рэсурсы, завязаць цесную сувязь з калгасамі, вясковымі каапарганізацыямі, прамарцелямі і ацільцохамі.

Вось што вырашае зараз пытанне аб разгортванні таваразвароту.

Вялікае значэнне набывае правільнае кіраўніцтва работай ПРЫГАРАДНЫХ ГАСПАДАРАК. Яны павінны стаць асноўнай харчовай базай прадпрыемства, асноўнай крыніцай снабжэння рабочых с.-г. прадуктамі.

І нарэшце, больш увагі і дапамогі ЦЭХАМ ГРАМАДСКАГА ХАРЧАВАННЯ. Якасць харчавання—на першы план! Мала—даць рабочаму абед. Грош цана такой сталоўцы, якая не можа за бяспечыць выдачы рабочым высокаякасных, танных абедаў.

«Забяспечыць на справе паспяховую барацьбу з усімі недахопамі грамадскага харчавання і ператварыць яго ў важнейшае звяно работы па паляпшэнню быта рабочага класа» (з пастановы ЦК УсеКП(б). Вось баявая задача як кіраўнікоў прадпрыемстваў, так і заводскіх арганізацый.

„Ударнікі" самазагатовак

«Шчотачная фабрыка імя Крупскай і Наркамлегпрам загатоўлялі мясапрадукты на прыватным рынку па спекуляцыйных цэнах». (З газет).

З вялізнай прыбылі такое
Гандлярская ўзнялася рань:
Кароўку бедную надвое
Хацелі хіўцы разадраць.
Жывёліне благое цела
Усёроўна аддаваць каму
Яна мычыць сябе нясмела
Спрадвечна ўпартае «му-му»!
Але цікавіць нас без меры,
Чаму запал — на рынку ўвесь,
І працы якасць рынкам мераць
І ЦРК і ОзРэС?!

Эпіграма ЮР. ЛЯВОННАГА.

Закінуты ўчастак кааперацыйнай работы

Самы закінуты ўчастак работы спажывецкай кааперацыі — гэта СВІНААДКОРМ. Нядаўна брыгады ЦКК НК РСІ БССР праверылі, як выконваюцца дырэктывы картэлі аб развіцці жывёлагадоўлі, аб стварэнні ўласнай харчовай базы.

Белкаапсаюз сарваў план развіцця свінаадкорма і трусагадоўлі ў 1933 годзе.

Белкаапхарч і сельгаскіраўніцтва Белкаапсаюза павінны былі паставіць на адкорм 9.824 свінні. Фактычна адкармліваецца 2.833 свінні ці 29 проц. задання.

Трэба было звяць з адкорма 6.168 галоў, звята—3283, пры чым характэрна, што звята з адкорма больш, чым паставлена.

Да гэтага трэба дадаць, што з прычыны зусім дрэннага догляду падсвінкі жывёлы, асабліва маладняка, дасягнуў вялікіх памераў. Паводле даных сельгаскіраўніцтва БКС за 7 месяцаў пала 1.370 штук.

Замест разгортвання свінагадоўлі для снабжэння рабочых мясапрадуктамі Белкаапсаюз дапусціў злачынна-нядбайныя адносіны да адкормачных аперацый.

Не лепш спраўляюцца са сваімі заданнямі райсаюзы і сельспажыўтаварыствы. 30 тысяч свіней яны павінны былі паставіць на адкорм, 972 тоны мяса яны павінны былі здаць для патрэб цэнтралізаванага рабочага снабжэння. План адкорма першага паўгоддзя выканан толькі на 14,2 проц., а задание на здачы прадукцыі на 9,7 проц.

За зрыў важнейшай работы поўнасцю адказваюць кіраўнікі Белкаапхарча т. СУЛЬКІНА, Сельгаскіраўніцтва тав. ШЛЕЙФЕР і адкормачнай канторы БКС т. ЦОФІН.

У Белкаапхарчы кіраўніцтва свінаадкормам было даручана зоатэхніку тав. ВІЛЬНЕР, якая па працягу ўсяго года толькі адзін раз выязджала на месца, склала акты аб агідных фактах і замарынавала іх пад сукном.

Работнікі сельгаскіраўніцтва і адкормачнай канторы кіравалі з канцылярый, не ведаючы аб фактычным становішчы на месцах.

Абслугоўванне ЦКК НК РСІ выявіла рад агідных фактаў: у большасці праверэных гаспадарак — поўная безгаспадарчасць, бесплянавасць, злачынна скарыстоўваюцца карпы, няма зоатэхнічнага і ветэрынарнага догляду. У выніку сабекошт прадукцыі дасягнуў надзвычай вялікіх памераў: на каапгасе швейнай фабрыкі імя Дзяржынскага 1 кгр. свінні жывой вагі абыходзіцца ў 16 руб., труса ў 50 р., а па бабруйскім лесакамбінаце адпаведна — 10 руб. і 97 руб.

Большасць праверэных гаспадарак свінагадоўчы пункт ЦРК — Менск, гаспадарка Білева — Віцебск, фабрыка «Касцярнік» — Менск) не забяспечылі свінарнік і трусятнік на асенне-зімовы перыяд кармамі і ацепленым памяшканнем. Спушчаныя крэдыты не скарыстоўваюцца.

Гэтыя факты сведчаць аб ігнараванні важнейшай задачы паляпшэння рабочага снабжэння.

Адна з галоўных задач трохгутнікаў прадпрыемстваў і ўсёй пралетарскай грамадскасці змагацца за захаванне стада, за ўзорны свінарнік і трусятнік, за стварэнне моцнай харчовай базы прадпрыемстваў.

ЛІБО.

Саюзнікі бракароба—за кааперацыйным прылаўкам

У бліжэйшыя дні ў Менску і Віцебску адбуцца паказальныя грамадскія працэсы над распаўсюджвальнікамі брака ў гандлёвым апараце. Да адказнасці прыцягнуты работнікі кааперацыйных крам: **Жытніковіч, Дульцін, Чарапаха, Асокіна, Эйко, Прэс, Гентман, Якабсон і Біргер.** Усяго 9 чал. У чым абвінавачваюцца гэтыя работнікі?

Праверка раздробнай сеткі, праведзеная брыгадамі «Звязды», Белкаапсаюза, ЦК саюза работнікаў кааперацыі і дзяржгандля, паказала, што **многія крамы не ўстанавілі заслона супроць брака,** не змагаліся за якасць прадукцыі, дапусцілі засмечанне крам ямна нягодным таварам, навязвалі брак спажыўцу.

Возьмем **краму № 2 МГРК** на рынку. Яна заклікана абслугоўваць не толькі гарадскога, але і сельскага спажыўца. Устаноўлена, што ў гэтай краме амаль немагчыма знайсці добраякасны тавар. У акце брыгады таварыца проста: «На любой паліцы знойдзеш толькі брак». Заржаўленыя, нягодныя капалькі па 3 р. 15 к. Нягодныя, бракаваныя люстэркі па 3 р. 70 к. і 1 р. 35 к., трохі самай горшай якасці па 60 кап. Брыгада падкрэсліла, што гэты тавар нельга было прадаваць нават са скідкай у 75 проц. Але ім гандлявалі, яго рэкамандавалі спажыўцу. Перад дзвярыма крамы выстаўлен рад крэслаў. Іх нельга нават назваць «бракам». Гэта—проста клам, якому месца ў рамонтнай майстэрні.

Не гледзячы на тое, што ў краме накапілася шмат брака, ніхто не клапаціўся аб зніжэнні цэн. Наадварот, рад тавараў у краме № 2 прадаваўся значна даражэй, чым у іншых. Секачы дрэннай якасці прадаваліся па 3 р. 50 кап., у той час, як у суседняй краме прадукцыя лепшай якасці каштавала 2 р. 50 кап. Падковы, непадыходзячыя для сялянскага каня па размерах, без дзюрак для цвікоў, прадаюцца па 1 р. 80 к., а ў іншых магазінах значна лепшыя падковы адпускаюцца па 82 кап.

Брыгада выявіла, што работнікі крамы № 2 не толькі распаўсюджвалі брак, але самі псавалі тавар. У краме знойдзена шмат футляраў для электрычных ліхтароў і дзіцячых цацак, прыведзеных у нягоднасць з-за дрэннага хавання, Гарнітур быў пакрыт такім густым пылам, што можна было на ім пісаць, як на прыфельнай дошцы. Так адгесліся работнікі крамы—Жытніковіч, Чарапаха і Дульцін да абслугоўвання спажыўца.

Такую работу можна толькі кваліфікаваць, як простую дапамогу бракаробам і спекулянтам. Ігнараванне патрабаванняў спажыўца прывяло да зрыва плана таваразвароту. Нават пасля абследвання брыгады работнікі крамы не прынялі ніякіх мер да палепшэння работы.

У такім-жа становішчы знаходзіцца крама № 11 МГРК. На паліцах тыя-ж экспанаты: заржаўленыя іголкі, засохшая мазь для абутка «фушк» (70 скрынак па 45 кап.), абгрызеныя мышамі вешкі, бракаваныя пробні і інш. Гэты нягодны тавар не толькі не быў спісан, але нават пры перагляду неўхвалены. Гэта злачынная дзейнасць абгрунтавана сваёасаблівай «тэорыяй», якую прапаведвала брыгадзе загадчыца крамы **Асокіна.** «Нам весці барацьбу за якасць не трэба, мы не прымушаем браць тавар, а калі пакупнік жадае, чаму яму не прадаць».

А як абслугоўвае спажыўцоў крама БАКТа № 2 (загадчык Эйг), якая прадае канцылярскія і школьныя прылады? У скрынках ляжаць ножыкі на 2 р. 70 к.—яўны брак, якога нельга і ў рукі браць. Іх прадаюць, іх паказваюць і рэкамандуюць спажыўцу. У краме шмат канвертаў з добрай паперы, але ні адзін не заклейваецца. А якія ручкі прадаюць вучням? Яны каштуюць 8 кап. Ні адну з іх нельга назваць добраякаснай, ні ў адну пяро не ўлазае. Яўны хлам! У прысутнасці брыгадзіраў, не гледзячы на іх пратэсты, работніца **Прэс** прадала 2 такія ручкі аднаму з спажыўцоў.

Загадчык крамы № 1 ЗРК друкарні імя Сталіна Гантман па-свойму «рацыяналізаваў» барацьбу за якасць. Замест таго, каб складаць акты на непадобраякасны тавар і рабіць уцэнкі, ён, калі пакупнік заўважае яго-небудзь дэфект, «дагаварваецца» з ім аб скідцы. У краме прадаюцца плеценыя кошыкі, з якіх большасць бракованых, па 3 р. 20 кап. На самым відным месцы вісіць жаночая сукенка цаной у 35 руб. Спыта яна агідна дрэнна, прадукцыя, годная толькі на ўціль. Вісіць яна больш года, без усякай уцэнкі. «Робіца,—як скажа загадчык,—скідка ў кожным асобным выпадку па дагаворанасці». У краме ёсць шмат іншыя «каштоўнасці». Ніткі цаной 20 руб. клг. Іх ніхто не купляе, бо гэта брак. Больш года ляжыць 8.000 пачак зусім нягоднага перца, больш падобнага на кофе; а цана не малая—25 к. пачка. Увесь склад завален палавымі шчоткамі, запаса якіх хопіць больш чым на 2 гады. Такія-ж «параджі» і ў краме ЗРК імя Варашылава (заг. **ЯКУБСОН**).

Усе гэтыя факты паказваюць, што дагэтуль многія работнікі кааперацыі ігнаруюць лозунг: «Совецкі магазін бракам не гандлюе», ігнаруюць законныя патрабаванні спажыўца.

Максімаў.

Апраўдаць годнасць вядучага ЗРК

Завод імя Варашылава — вядучы машынабудаўнічы завод у Менску. На ЗРК гэтага завода ўскладзены асабліва адказныя абавязкі. Як-жа ён спраўляецца з імі?

ЗРК імя Варашылава лічыцца адным з лепшых у Менску. Ён выканаў план таваразвароту за 2 квартал на 95,6 проц., за траці — на 100 з лішнім. Ён поўнасцю выканаў план мабілізацыі сродкаў.

У асардыменце тавараў, выданых рабочым у 2-м квартале, дэцэнтралізаваныя загатоўкі сельгаспрадуктаў займаюць 32,5 проц. Спецыяльныя загатоўшчыкі ЗРК пранавалі ў Слуцкім раёне і перыферычна пасылалі прадукты. ЗРК забяспечыў пераважнае снабжэнне лепшых ударнікаў. Апрача звычайных пайкоў яны атрымалі расліннае масла, галандскі сыр, селядцы і інш. За апошнія два

У пазапланавым парадку было закуплена прамтавараў на 108 тысяч руб. Рабочыя атрымалі гатовую вопратку, меблю, абутак, трыкатаж, мыла, галантарэю, Утыльцэх завода рэалізаваў розных металічных вырабаў па 15 тыс. руб.

Сталоўка пры заводзе, якая абслугоўвае 1.200 рабочых, арганізавала спецыяльны стол ударніка, дабілася шырокай механізацыі работы на кухні. На працягу 2 і 3 квартала яна забяспечыла выдачу ў большасці выпадкаў мясных абедаў.

Але трэба сказаць, што за апошнія месяцы работа ЗРК значна пагоршылася. Аб гэтым сведчыць хаця-бы той факт, што загатоўшчыкі за ўвесь 3 квартал закупілі прадуктаў толькі на 8,5 тыс. руб. — амаль у 10 раз менш, чым у 2-м квартале.

Брыгадзір ГАРАДЗІШЧ.

Плады кабінетнага кіраўніцтва

БАБРУЙСК. ЗРК швейнікаў, які абслугоўвае буйнейшую фабрыку імя Дзяржынскага, усю сваю работу набудаваў на рэалізацыі плануемых тавараў.

ЗРК нічога не зрабіў, каб стымуляваць ударную работу на вытворчасці.

У жніўні ўдарнікі атрымлівалі палепшаныя абеды. Па-колькі дырэкцыя не запланіла датацыі ў суме 4.200 руб., стол ударнікаў быў ліквідаваны: праўленне пашло на лінію найменшага супраціўлення.

Угласная харчовая база ЗРК у заняпадзе. Патрэбу ў бульбе каапгас пакрывае толькі на 60 проц. План засолкі гуркоў і памідораў выкананы усяго на 54 проц. Дойныя каровы не могуць забяспечыць нават патрэбаў дыетычнага харчавання. Дрэннае гаспадараванне прывяло да страт у 25 тысяч руб.

Сельска - гаспадарчае кіраўніцтва БКС абмежавалася тым, што дала ЗРК прыгарадную гаспадарку, але не аказала ніякай дапамогі ў арганізацыі работ. Сектар рабочага снабжэння выдаваў парады, але не сачыў за тым, як яны выкопваюцца. ЗРК швейнікаў атрымаў на траці квартал парады на 1.000 банак кансерваў і на 460 кгр. цукру. Ужо даўно прайшоў траці квартал, а парады не рэалізаваны.

В — й.

НЕ ЗДАВАЦЬ ПЯРШЫНСТВА!

ВІЦЕБСК.

УДАРНІКІ ФАБРЫКІ «ДЗВІНА» ПАБАЯВОМУ ЗМАГАЮЦЦА ЗА ПЕРАТВАРЭННЕ СВАЁЙ СТАЛОЎКІ ВА ЎДАРНУЮ.

ЗА АПОШНІ ЧАС ЗНАЧНА ПАЛЕПШЫЛАСЯ ЯКАСЦЬ АБЕДАЎ ПРЫ ЗНІЖЭННІ КОШТА. ЗАМЕСТ РАНЕЙШЫХ 60-70 КАП., АБЕД КАШТУЕ 47-50. КАЛАРЫЙНАСЦЬ ПАВЫСІЛАСЯ.

ЗНАЧНА ЗМЕНШЫЛІСЯ ЧАРГІ ЗА ТАЛОНАМІ. 15 МІНУТ МАКСІМУМ ПАВІНЕН ЗАТРАЦІЦЬ РАБОЧЫ НА АБЕД.

ЛІКВІДАВАНА АБЯЗЛІЧКА Ў АБСЛУГОЎВАННІ АБЕДАЮЧЫХ. У АПОШНІ ЧАС АРГАНІЗАВАНЫ ТРЫ БРЫГАДЫ, БРЫГАДЗІРАМІ ВЫЛУЧАНЫ ЛЕПШЫЯ ЎДАРНІКІ, СТАЛЫ ПРЫМАЦАВАНЫ ДА АБСЛУГОЎВАЮЧАГА ПЕРСАНАЛА.

МНОГАЕ ЗРОБЛЕНА Ў НАПРАМКУ МЕХАНІЗАЦЫІ РАБОТ НА КУХНІ.

ДА ГЭТАГА ТРЭБА ДАДАЦЬ ПАЛЯПШЭННЕ САНІТАРНА-ГІГІЕНІЧНАГА СТАНОВІШЧА СТАЛОЎКІ ФАБРЫКІ.

ЦЭХ ГРАМАДСКАГА ХАРЧАВАННЯ ФАБРЫКІ «ДЗВІНА» Ў МІНУЛЫМ ГОДЗЕ ВЫШАЎ НА ПЕРШАЕ МЕСЦА Ў КОНКУРСЕ СТАЛОВАК БССР.

І СЁЛЕТА ЁН ПАВІНЕН ДАБІЦЦА ЗАВАЯВАННЯ ПЯРШЫНСТВА. С.

ЛЕПШЫЯ СТАЛОЎКІ ГОМЕЛЯ

ГОМЕЛЬ.

АДНОЙ З ЛЕПШЫХ СТАЛОВАК ГОМЕЛЯ З'ЯЎЛЯЕЦЦА СТАЛОЎКА ЗАВОДА ІМЯ ЛАНЦУЦКАГА. БОЛЬШ 6.000 СТРАЎ ВЫПУСКАЕ ЯНА ШТОДЗЕННА. КАЛЯ 2.000 РАБОЧЫХ ПРАХОДЗІЦЬ ПРАЗ ЯЕ. І НІХТО НЕ ЧАКАЕ ПАДАЧЫ АБЕДА БОЛЬШ 20 МІНУТ. ВЫБАР СТРАЎ У СТАЛОЎЦЫ ВЕЛЬМІ РОЗНАСТАЙНЫ. МЕНЮ ЧАСТА НАЛІЧВАЕ ЗВЫШ 15 СТРАЎ. УДАРНІКІ АТРЫМЛІВАЮЦЬ АСОБНЫЯ АБЕДЫ ЛЕПШАЙ ЯКАСЦІ.

БРЫГАДЗІР ЦЭХА АФІЦЫЯНТАК ТАВ. КАРТУЗАВА ЎМЕЛА НАЛАДЗІЛА РАБОТУ, ПРЫМАЦАВАЎШЫ ДА КОЖНАЙ АФІЦЫЯНТКІ АСОБНЫЯ ЎЧАСТКІ. СТАРЭЙШЫ КУХАР ТАВ. БАРСУКОЎ НЕПАСРЭДНА КІРУЕ ЎСІМ ПРАЦЭСАМ АПРАЦОЎКІ ПРАДУКТАЎ.

СТАЛОЎКА МАЕ ДОБРА АБСТАЛЯВАНЫ СВІНАРНІК. ЗАРАЗ БОЛЬШАЯ ЧАСТКА СЕЛЬГАСПРАДУКТАЎ, У ПРЫВАТНАСЦІ ГАРОДНІНЫ, ПАСТУПАЕ З ПРЫГАРАДНАЙ ГАСПАДАРКІ.

ДАСЯГНЕННІ СТАЛОЎКІ З'ЯЎЛЯЮЦЦА ВЫНІКАМ ТАГО, ШТО ЯК ДЫРЭКЦЫЯ, ТАК І ЗАВОДСКІЯ АРГАНІЗАЦЫІ ШМАТ АДДАЛІ ЎВАГІ ПАЛЯПШЭННЮ РАБОТЫ ЦЭХА ГРАМАДСКАГА ХАРЧАВАННЯ.

ЗНАЧНАГА ПАЛЯПШЭННЯ ЯКАСЦІ АБЕДАЎ ДАБІЛАСЯ І СТАЛОЎКА ГОМЕЛЬСКАЙ ШЧАЦІННАЙ ФАБРЫКІ. РАБОЧЫМ ПРЫХОДЗІЦЬ ЧАКАЦЬ АБЕДА НЕ БОЛЬШ 15-20 МІНУТ. ВЯЛІКАЯ ЗАСЛУГА БРАКЕРАЖНАЙ КАМІСІІ І ПРЫМАЦАВАНЫХ САНІТАРНЫХ ДАКТАРОЎ У ТЫМ, ШТО ЯНЫ ДАБІЛІСЯ ЎЗОРНАГА ГІГІЕНІЧНА - САНІТАРНАГА СТАНОВІШЧА СТАЛОЎКІ. КУХНЯ АДРАМАНТАВАНА. СТАЛЫ ДЛЯ АПРАЦОЎКІ ПРАДУКТАЎ ПАКРЫТЫ ЦЫНКАВЫМ ЖАЛЕЗАМ, ПАСТУПАЮЧЫЯ ПРАДУКТЫ ДОБРА ЗАХОЎВАЮЦЦА Ў АДРАМАНТАВАНЫХ СКЛЕПАХ І КЛАДОЎКАХ.

ЛІБЕРМАН, ФРОНІН, ЧЭРНІН.

Вялікая магчымасць і мізэрныя рэзультаты

ВІЦЕБСК.

ЗРК «Чырвоны металіст» абслугоўвае 1.260 рабочых. База для яго дзейнасці даволі моцная: ён мае прыгарадную гаспадарку, сталоўку, 6 крам і 3 ларкі, забяспечаныя сродкамі для таваразвароту.

Аднак, праўленне ЗРК не здолела пабудаваць работу, наладзіць гібкае аперацыйнае кіраўніцтва ўсімі ўчасткамі. План таваразвароту не выконваецца з квартала ў квартал. За другі квартал недаступіла 10 тысяч руб., за траці — больш 50 тысяч рублёў.

ЗРК разгортваў гандаль толькі плануемымі таварамі і ігнараваў непланавыя закупкі. Апошнія займаюць у таваразвароце толькі 16 проц. Вось адна з асноўных прычын невыканання гандлёва-фінансавага плана.

Месяцы два назад ЗРК быў прымушаны для выдзелення самазагатовак да 6 сельсоветаў Лёзненскага раёна. Ён атрымаў усе магчымасці для паляпшэння рабочага снабжэння. Аднак, ЗРК не скарыстаў гэтых магчымасцей. Ён не наладзіў цеснай сувязі з вясковымі каапарганізацыямі і калгасамі. ЗРК абмежаваўся пасылкай 2 чалавек, якія загатовілі мізэрную колькасць прадуктаў. У траціім квартале загатоўлена 157 кгр. масла, 2.700 яек, 400 кгр. бульбы, 72 літры малака і 8 тон мяса (жывой вагі). Адсюль зразумела, што 80 проц. прадуктаў, выдаваемых рабочым, складаюць цэнтралізаваныя тавары.

Дрэнна пастаўлена грамадскае харчаванне.

Аб гэтым гаворыць хаця-б той факт, што колькасць адпушчаных у сталоўцы блюд, за 2 месяцы зменшылася з 88 тысяч да 73.000. Многі рабочыя, якія раней абедалі ў сталоўцы, перайшлі на хатняе харчаванне. ЗРК, партыкалектыў і фабком не прынялі ніякіх мер, каб палепшыць работу сталоўкі. Больш таго. Яны праявілі бюракратычныя, бяздушныя адносіны да забеспячэння лепшых ударнікаў. У верасні спынілі выдачу палепшаных абедаў ударнікам. Матыў гэтага галавацяпскага ўчынку — «вельмі прунтоўны»: прынцыпіх яе даў спісаў. У рабочым снабжэнні панае ўрэгулёўка і абязлічка: лепшы ўдарнікі і героі пяцігодкі не карыстаюцца пераважамі.

Для характарыстыкі работы прыгарадняй гаспадаркі даволі прывесці адзін факт: па плану намечаны ўраджай бульбы з 82 га — 984 тоны. Фактычна ўбрана не больш 500. Безгаспадарчасць, дрэнная арганізацыя працы прывялі да вялікіх страт...

Толькі ў апошні час пасля абследвання ЗРК прыняў рад канкрэтных мер да разгортвання самазагатовак—у сельсоветы пасланы адказныя работнікі.

Брыгада ЦКК НК-РСІ і «Звязды»
КАГАН, СВЯРДЛОЎ.

АБ ЦЭНАХ НА ГАРОДНІНУ І КАНВЕНЦЫЙНЫХ БЮРО

У «Правде» быў нядаўна надрукаван артыкул аб дзейнасці канвенцыйных бюро БССР. У гэтым артыкуле быў прыведзены рад фактаў дрэннай работы бюро, асабліва ў галіне ўстанаўлення канвенцыйных цэн на сельгаспрадукты, загатоўленыя ў дэцэнтралізаваным парадку. Можна прывесці рад новых даных, якія сведчаць аб дрэнным кіраўніцтве канвенцыйных бюро загатоўкамі на месцах.

У Старадарожскім раёне ўжо з красавіка месяца сядзіць прадстаўнік ОРС'а ленінградскага завода імя Карла Маркса. Гэты ўпаўнаважаны ўжо выдаткаваў на раз'езды і на зарплату звыш 8.000 руб. і не адпраўіў у Ленінград ні аднаго вагона гародніны. Прадстаўнік шыпнага завода «Красный трехугольник» выдаткаваў 6.000 руб. і таксама нічога не адпраўіў.

У чым тут справа? Ёсць рад выпадкаў, калі калгаснікі і аднаасобнікі, выканаўшы цэнтралізаваны план здачы гародніны, зусім спыняюць продаж гародніны загатоўчым арганізацыям і скарыстоўваюць сталовую моркву і буракі для корма жывёлы або прадаюць гародніну на рынку. Між тым ва многіх раёнах дэцэнтралізаваныя загатоўкі гародніны займаюць на сваёй удзельнай вазе 60-75 проц. цэнтралізаванага плана.

Асноўная прычына, якая тармозіць загатоўкі, гэта **разкая неадпаведнасць цэн паміж асобнымі кармавымі культурамі.**

Цэны на сена і салому, якую купляюць многія гаспадаркі для кармлення жывёлы, значна вышэй, чым канвенцыйныя цэны на першагатункавую гародніну. Загатобожка прадае сена ўкоса 1931 і 1932 г. па 170 руб., а салому па 130 руб. за тону. Канвенцыйная-ж цана на гародніну ў гэтым годзе ўстаноўлена наступная: морква — 70 руб., сталовы бурак — 60 руб. тона. Такія вялікія «ножніцы» паміж цэнамі прыводзяць да масавага звінчэння гародніны ў корм жывёле.

Ёсць загатоўшчыкі, якія пасцелі завуцяць прызначаную колькасць гародніны. Але якім шляхам дасягнута гэта? Яны нескаромна павысілі канвенцыйныя цэны, маскуючы гэта пад відам выдаткаў на «дастаўку», «упаковку» і інш.

У рэзультаце дрэннай работы па рэгулляванні цэн фонды рабочага снабжэння разбазарваюцца на кармленне жывёлы. Канвенцыйнае бюро ўпаўнаважанага СНК павінна неадкладна заняцца гэтым пытаннем.

Трэба больш гібка планаваць загатоўчыя цэны.

П.

ЧАМУ ГОМЕЛЬСКІ ДРЭВААПРАЦОЎЧЫ КАМБІНАТ У ПРАРЫВЕ?

Гомельскі камбінат імя Гікало з'яўляецца адным з буйнейшых прадпрыемстваў дрэваапрацоўчай прамысловасці. Ён нядаўна ўступіў у эксплатацыю і з'яўляецца адным з 518 прадпрыемстваў, набудаваных у траціім годзе першай пяцігодкі. Ён абсталяваны паводле апошніх патрабаванняў тэхнікі.

Завод павінен даць у гэтым годзе звыш 10 тыс. тузін шутай меблі і некалькі дзесяткаў тысяч павозак. Аднак, камбінат сістэматычна не выконвае сваёй вытворчай праграмы. Лесацэх «Соцыялізм» у верасні выканаў сваю праграму на 74 проц. Абозны цэх за 9 месяцаў выканаў прамфінплан на 48 проц. Самым адсталым цэхам камбіната з'яўляецца меблявая фабрыка, якая за 9 месяцаў выканала вытворчую праграму на 28 проц.

Дзе прычыны прарываў у рабоце камбіната?

Мы павінны з усёй рашучасцю заявіць, што кіраўніцтва прадпрыемства (дырэктар Штырляеў, сакратар парткома Хайкін, старшыня заўкома Долінаў) не перабудавалі сваёй работы на аснове дырэктыў партыі.

Ігнаравалася адна з важнейшых умоў перамогі — **паляпшэнне соцыяльна-бытавых умоў рабочых.**

У выніку — вялікая цякучасць рабочай сілы, якая вельмі адмоўна адбілася па выкананні прамфінплана. У сярэднім за 8 месяцаў прынята 297 новых рабочых, а звольнілася — 467. Цякучасць складае каля 10,5 проц.

Сакратар ЦК КП(б)Б тав. **ГІКАЛО** у пачатку красавіка г. г. наведаў камбінат і дэталёва азнаёміўся з вытворчасцю.

Ён адзначыў вялікія непаладкі, дрэннае харчаванне рабочых. Як дырэктар камбіната, так і парткалектыў і фабком, — падкрэсліў т. Гікало, — павінны поўнасцю адказваць за паляпшэнне матэрыяльна-бытавых умоў рабочых.

Трэба адзначыць, што ні партыйны камітэт, ні заўком не ўзялі ўрокаў з указанняў тав. Гікало. Яны не выканалі дырэктыў партыі аб паляпшэнні рабочага снабжэння. Яны не адчуваюць той вялікай адказнасці, якая на іх ускладзена.

Запытайцеся ў ЗРК і заводакіраўніцтва, хто вінават у дрэнным становішчы рабочага снабжэння. ЗРК будзе ківать на гаспадарнікаў, а гаспадарнікі ўзвальваць усю віну на ЗРК.

Старшыня праўлення ЗРК **ФІНКЕЛЬШТЭЙН** наогул сабатуе работу, ігнаруе загады дырэкцыі, дазваляе сабе на цэлых днях не выходзіць на работу, бо ён «не хоча працаваць на камбінаце». А партком ліберальнічае з сабатажнікам.

Не гледзячы на пастанову Белкаапсаюза аб забароне скарыстання зваротных сродкаў для розных іншых мэт, праўленне ЗРК забрала 76 тыс. руб. зваротных сродкаў і ўклала іх у прыгарадную гаспадарку. Гэта паралізавала таваразваварот. Загадчык сектара снабжэння ЗРК **Матузаў** у верасні набыў на гомельскай базе прамтавараў на суму 8 тыс. руб., але з-за адсутнасці сродкаў тавары не выкуплены. На працягу ўсяго летняга сезона крамы ЗРК не мелі кваса і сельтарскай вады, і рабочым камбіната прыходзілася ісці шукаць гэтых напіткаў за 5 клм. у горадзе.

Справа ў тым, што камбінат «Спартак» адмовіўся снабжаць прадпрыемства таму, што ЗРК не плаціў грошай. У верасні прыбыў мёд і цукар, але з-за адсутнасці сродкаў гэтыя прадукты таксама не выкуплены. Аб гэтых агіднасцях сігналізавала шматтыражка камбіната, але ніякіх мер не прынята.

ЗРК камбіната мае 5 магазінаў. Аднак, ніякіх дэцэнтралізаваных закупак не праводзіцца, і магазіны працуюць ад пайка да пайка, ад свята да свята. Нават такіх тавараў, як іголкі, гузікі, начынне і інш. вы ў магазінах не знойдзеце. Работнікі крам не вядуць ніякай барацьбы за добрую якасць тавараў. У траціім квартале не было складзена ні аднаго акта на засылку бракаваных тавараў.

Работнікі ЗРК не ўлічылі каронных змен у попыце спажыўца, не ўлічылі таго, што рабочы не возьме зараз абы якое барахло.

Наогул крамы размяркоўваюць толькі тыя прадукты, якія паступаюць у планавым парадку.

Няма чаго і гаварыць аб пераважным снабжэнні ўдарнікаў. Яны забяспечваюцца пароўні з іншымі.

Не лепш малюнак мы ўбачым і ў сталоўцы.

Сталоўка не ператварылася ва ўдарнікаў.

Ударны цэх камбіната, яна не перабудавала сваёй работы.

Стандартны меню, поўная абязлічка ў абслугоўванні, антысанітарнае становішча памяшкання, ігнараванне такіх дробязей, як чыстыя лыжкі — усё гэта характарызуе работу сталоўкі. 13 кастрычніка абозны цэх з 200 чал. прачакаў 30 мінут з-за таго, што абед не быў гатоў своечасова. Патрапілі лішніх 30 мінут і трапе партнікі. Такія з'явішчы можна бачыць даволі часта. Аб гэтым добра ведае старшыня ЗРК Фінкельштэйн, але мер не прымае.

Характэрна, што сталоўка загатоўляе прадукты на прыватным рынку. У ліпені, жніўні купілена прадуктаў на рынку амаль на 17 тыс. руб. Між тым камбінат прымацаван да Кармянскага раёна, дзе ён можа разгортваць самазакупкі. Замест таго, каб заключаць дагаворы з калгасамі, з райсаюзамі, ЗРК купляе прадукты на рынку па павышаных цэнах.

Няма нічога дзіўнага ў тым, што абеды ніякай якасці капітуюць вельмі дорага, што яны ні на цане, ні па якасці не задавальняюць рабочых.

На камбінаце ёсць сталоўка для ІТР, якая абслугоўвае каля 120 чалавек. А якія там абеды? Адпастайныя, нясмачныя, поспыя абеды каштуюць 1 руб. 30 — 1 руб. 50 кап. Неарганізаваны сталы ўдарнікаў. Лепшыя ўдарнікі абедаюць пароўні з іншымі.

Нядаўна бюро парткома спецыяльна абгаварвала пытанне аб лепшым абслугоўванні ўдарнікаў і пастанавіла: «Пад адказнасць старшыні праўлення ЗРК тав. Фінкельштэйна да 12 кастрычніка арганізаваць і пачаць работу сталоў ударнікаў». А што вынікла на справе? Фінкельштэйн і не думае аб рэалізацыі гэтай дырэктывы.

Некалькі слоў аб раскр

Заява т. Даўгалеўскага

ЖЭНЕВА, 16.

Генеральная камісія канферэнцыі па разбраенні ўхваліла прапанаваны Гендэрсонам адказ Нейрату пры ўстрымаанні ад галасавання делегацый СССР, Польшчы і Турцыі. Потым генеральная камісія пастанавіла адтэрміновать далейшыя работы канферэнцыі па разбраенні да 26 кастрычніка.

Тав. Даўгалеўскі, матывуючы ўстрымалае совецкай делегацыі ад галасавання, заявіў:

«Совецкая делегацыя не стала перашкаджаць супроць пасылкі Нейрату адказа ад імя старшыні канферэнцыі. Совецкая делегацыя падтрымлівае, аднак, што гэта не павінна быць растлумачана, як выяўленне згоды совецкай делегацыі з тэкстам адказа ў цэлым. Сам раўды, тэкст адказа спасылаецца на падзеі, і прынцыпы на перагаворах, якія адбываліся паралельна з канферэнцыяй паміж некаторымі дзяржавамі. Совецкая делегацыя не можа несці адказнасць, калі справа ідзе аб перагаворах, у якіх яна не прымала ніякага ўдзела».

Польская і турецкая делегацыі падтрымалі выступленне т. Даўгалеўскага.

ПАЛЕМІКА НЕЙРАТ—САЙМОН

ЛОНДАН, 17. (БЕЛТА).

Як паведамляюць ангельскія газеты, германскі міністр замежных спраў Нейрат заявіў прадстаўнікам германскага друку, што Саймон стварыў няправільнае прадстаўленне аб тым, нібыта прадстаўнікі Германіі занялі ў Жэневе больш прымірэнчую пазіцыю, чым у Лондане і што ён нібыта неадкладна паведаміў амерыканскаму ўраду аб патрабаваннях Германіі ў пытаннях разбраення.

***

ЛОНДАН, 17. (БЕЛТА).

Як паведамляе агенцтва Рэйтэр, Саймон з повалу выступленняў газет аб выпадах Нейрата супроць яго, заявіў: «Я шкадую, калі ёсць якія-небудзь разгалоссі з баронам фон-Нейратам з повалу фактаў. Мае адназемцы могуць быць упэўнены, што за неадкладнасць аб якой гаворыцца, віна ляжыць не на мяне.

НА ПАСЛУГАХ У ГІТЛЕРА

ВАРШАВА, 16. (БЕЛТА).

«Кур'ер Подзенны» выступае з выкрываннем махінацый дэпутатаў польскага сойма Рудніцкай і Пеленскага якія належаць да УНДА (украінскае нацыянальнае дэмакратычнае аб'яднанне) за кулісамі кампроса нацменшасцяй у Берне і Лігі нацый у Жэневе. «Кур'ер подзенны» заявіў, што абодва ўкраінскія дэпутаты адыгрываюць ролю агентаў Берліна. Набываючы перад кампросам у Берліне, прадстаўнікі УНДА на «зялёным кампросе» (у Берне) рашуча падтрымлівалі германскую делегацыю, у прызначэнні ў пытанні аб праследаванні яўрэяў у Германіі. Характэрна, што украінскія дэпутаты іншых краін не падтрымалі прадстаўнікоў УНДА.

— Украінскія дэпутаты польскага сойма, — заўважае «Кур'ер подзенны», — скакалі пад дудку прыбыўшага з Берліна делегата так званай «Грамады» Яры, звязанага з Канавальцам (украінскі фашыст).

Украінскія дэпутаты ў Жэневе прабавалі сабраць подпісы пад антысовецкай петыцыяй у Совет Лігі нацый. Уся гэта работа вялася пад кіраўніцтвам агента Канавальца, Яры.

Як паведамляе «Кур'ер подзенны», праект падачы петыцыі проваліўся, бо парламентарыі Буковіны і прадстаўнік украінцаў, пражываючы ў Канадзе, выказаліся супроць прошчукаў Рудніцкай і Пеленскага, заявіўшы ў адкрытым лісце, што яны супроць «ідэнфікавання украінскай грамадскасці з арганізацыяй украінскіх нацыяналістаў і работай на карысць Германіі».

УЗБРАЕННІ ГЕРМАНІІ

ПАРЫЖ, 17. (БЕЛТА).

Антыфашысцкі штотыднёвік «Гегенгіфт» апублікаваў здымак з накладной, пасланай 29 сакавіка германскай фірмай «Берлін Карпсруер індустрыебэкер» фірме «Ардэрбекер-Берлін».

У накладной гаворыцца аб адпраўцы ўзораў гранат і авіяцыйных бомб, прызначаных для выпрабавання ў Берліне.

Журнал сцвярджае, што пасля выпрабавання ваеннае міністэрства ўхваліла гэтыя ўзоры і пачаўся серыйны выпуск гэтага ўзбраення. Указаныя ў накладной бомбы, вагой у 12,5 кіло, прызначаны галоўным чынам для масавай бамбардыроўкі гарадоў. Затым журнал адзначае, што перанясенне вытворчасці ўзбраенняў з пагранічных раёнаў у цэнтр Германіі паказвае, што Германія знаходзіцца зараз напярэдадні войны з Францыяй.

Берлінскі працяг лейпцыгскай правакацыі

ПРАГА, 17.

На ўчарашнім пасяджэнні працэса аб падпале рэйхстага ў Берліне дапытваўся пейкі Шмаль, які, згодна абвінавачэнню, у дзень падпала ў 2 гадзіны дня бачыў нібыта перад рэйхстагам Торглера і Ван дэр-Люббе, аднак, на судзе Шмаль, наперакор сцвярджэнню напярэдадні следства, катэгарычна адмаўляе, што бачыў Торглера разам з Ван дэр-Люббе.

На пытанне старшыні да Ван дэр-Люббе, ці быў ён у 2 гадзіны дня каля рэйхстага, Ван дэр-Люббе маўчыць.

Наступны сведка Венігт сцвярджае, што ён бачыў Ван дэр-Люббе сярод удзельнікаў экскурсіі ў рэйхстаг за 8-14 дзён да падпала. Паводле слоў агенцтва Вольф, гэта пацвярджае нібыта і трэці сведка Голах, які, аднак, на ўчарашнім пасяджэнні суда заявіў, што ён не ўпэўнен у тым, што гэта быў іменна Ван дэр-Люббе.

Сведка — адказны за асвятленне рэйхстага—Шольц пацвярджае, што ён гутарыў з порт'е рэйхстага каля 8½ гадзін вечара, калі Торглер, Кенен і сакратар комфракцыі рэйхстага пакінулі будынак рэйхстага. Старшыня суда задае Шольцу «наводзячае» пытанне: «Яны хутка выйшлі?» Сведка адказвае: «Не, яны ішлі зусім звычайным крокам. Трэба адзначыць, што ўпяршыню пры допыце Шольца закранаецца пытанне аб падземным ходзе, які злучае будынак рэйхстага з домам Герынга.

Пракурор Вернер пытаецца Шольц ці былі звычайна зачынены дзверы, якія злучаюць падвал рэйхстага з гэтым падземным ходам. Сведка адказвае, што дзверы былі замкнуты, але што іх можна было адамкнуць агульным ключом ад падвала, які быў у працаваўных у падвале служачых. Та кім чынам, цэлы рад служачых рэйхстага, відавочна, мелі магчымасць адамкнуць гэтыя дзверы і упусціць каго згодна ў падземны ход.

СССР І ЗЛУЧАНЫЯ ШТАТЫ

ВАШЫНГТОН, 17.

Агенцтва «Асошыэйтэд прэс» паведамляе:

«Дамакратычны дэпутат Н'ю-Ёрка Сіровіч, які надаўна вярнуўся з Совецкага саюза, далажыў Рузвельту аб рэзультатах сваіх наглядзінняў у СССР. Прадстаўнікам друку Сіровіч заявіў, што на яго думку «прызнанне СССР з боку ПАША адбудзецца яшчэ на працягу гэтага месяца».

Па СССР

Узнагароджанне тав. Еўсеева

ЗАГАД РВС СССР № 163.

1. 10 кастрычніка 1933 г. інструктар парашутнай справы навукова-даследчага інстытута ВПС РСЧА т. Еўсееў зрабіў высотны зацяжны скачок з вышыні 7.200 метраў да 140 метраў з кіслародным прыладаю. Свабоднае падзенне працягвалася 132,5 секунды, за гэты час пакрыта 7.050 метраў.

2. За праяўленне настойлівасці ў рабоце па вырашэнню пастаўленай задачы, за добрую арганізацыю даследчага боку справы, а таксама смеласць і адвагу, узнагароджваю т. Еўсеева залатым падзённікам з секундамерам з надпісам: «Паверанаму байцу тав. Еўсееву за адвагу ад РВС СССР».

Народны Камісар па ваенных і морскіх справах і старшыня РВС СССР ВАРАШЫЛАЎ.

Масква, 17 кастрычніка 1933 г.

★ **ЗВЫШ 4-Х МЛН. РУБ.** дасягнулі да 16 кастрычніка добраахвотныя адлічэнні працоўных СССР на будаўніцтва самалёта «Максім Горкі».

Будаўніцтва самалёта разгортваецца поўным тэмпам на заводзе ЦАГІ. Зараз збіраюцца крылы самалёта-гіганта і закончана пабудова фюзеляжа. Ідзе ўгуппаванае абсталяванне, будуюцца калёсы і канчаецца зборка—нясі.

Для пасканарэння збору сродкаў на самалёт Усесаюзны Камітэт выпусціў спецыяльную марку «Пабудуем агітсамалёт «Максім Горкі», якая будзе пашыравацца праз культурна-асветніцкія ўстановы.

★ **ВЫРАБ МАГНІТА-ДЭТАЛЯЙ** з абаніта (цвёрдая гума) для аўтамабіляў, самалётаў і трактараў асвоіў завод «Каучук». Да апошняга часу гэтыя дэталі прывозіліся выключна з заграніцы.

Наркамцяжпрам тав. Орджанікідзе ў спецыяльным загадзе адзначыў дасягненні завода «Каучук». Дырэктару завода т. Шмідэль і тэхнічнаму дырэктару т. Вольпе абвешчана падзяка і выданы прэміі. У распараджэнне завода адпушчана легкавая машына. На прэміяванне лепшых ударнікаў Наркамцяжпрам СССР адпусціў 5.000 рублёў.

★ **УСЕСАЮЗНУЮ РАДЫЁ - ПЕРАКЛІЧКУ** аб ходзе радыёфікацыі паліт-адзелаў МТС і саўгасаў праводзіць радыёкіраўніцтва Шкоўвязі ўпачы з 19 па 20 кастрычніка.

★ **ШЭСЦЬ ЭЛЕКТРАВОЗАЎ**, зробленых на совецкіх заводах совецкімі спецыялістамі і рабочымі, блісчуча вытрымліваюць выпрабаванні на лініі Кізел Чусавая (Урал). Тры электравозы ўжо скончылі гарантыйны прабег з поўным складам поезда.

★ Новы Дом урала будзе скончан будаўніцтвам у Харкаве да кастрычніцкіх дзён. Гэта будзе адзін з найпрыгажэйшых будынкаў украінскай сталіцы. У новым доме 150 прастурных пакояў і кабінетаў.

АНТЫАНГЕЛЬСКІЯ ВЫПАДЫ ГЕРМАНСКАГА ДРУКУ

ПРАГА, 17. (БЕЛТА).

Як паведамляюць з Берліна, увесь германскі друк робіць рэзкія выпады супроць Англіі і, у прыватнасці, супроць Саймона. «Берлінер тагеблат» змяшчае спецыяльны яўна інспіраваны артыкул свайго лонданскага карэспандэнта, які ў адэкватным тоне выкладае пазіцыю Саймона ў апошніх яго асабістых перагаворах з Надольным. Лонданскі карэспандэнт называе Саймона «былым бліскучым адвакатам, прывыкшым да працэсаў, якія цягнуцца сто год».

ПАЗІЦЫЯ ПАЗШ У ЖЭНЕВЕ

ЖЭНЕВА, 18. (БЕЛТА).

Учора ўвечары амерыканская делегацыя апублікавала наступную заяву Нормана Дэвіса прадстаўнікам амерыканскай прэсы:

«Мы знаходзімся ў Жэневе выключна ў мэтах разбраення, і да таго часу, пакуль будзе ў наяўнасці магчымасць паспяхова працягваць перагаворы па разбраенню, мы будзем шчаслівы прымаць у іх удзел. Аднак, мы не зацікаўлены ў агульна-палітычных момантах, або ў пастаноўцы праблемы ў якімнебудзь чыста эўрапейскім аспекце. Мы зноў падкрэсліваем, што ні ў якой меры мы не звязаны палітычна ні з адной з эўрапейскіх дзяржаў.

На працягу гэтага тыдня адбудуцца нарады паміж эўрапейскімі ўрадамі. Мы не хочам прымаць у іх актыўнага ўдзела, бо гэтыя нарады будуць мець агульна-палітычны характар».

ВОДГУКІ ЯПОНСКАЙ ПРЭСЫ

ТОКІО, 17. (БЕЛТА).

Большасць японскіх газет прысвячае перадавыя артыкулы выхаду Германіі з Лігі нацый і з канферэнцыі па разбраенню.

Газеты лічаць, што выхад Германіі не адаб'ецца на становішчы Японіі, хоць, несумненна, ускладніць становішча ў Эўропе. Газета «Сіогіо» лічыць, што «бліжэйшымі вынікамі выхада Германіі з Лігі нацый і з канферэнцыі па разбраенні франка-германскіх супярэчнасцяй і паскарэнне прызнання СССР Злучанымі Штатамі».

«Ніці-Ніці» лічыць, што выхад Германіі з Лігі ставіць у парадак дня зрыў версальскага і локарнскага дагаворай.

Газета «Асахі» выказвае надзею, што выхад Германіі з Лігі звядзе на нішто германскія прэтэнзіі на былыя яе калоніі ў Ціхім акіяне (зараз мандатныя вышы Японіі).

РУКА АБ РУКУ З Б. КАЙЗЕРАМ ВІЛЬГЕЛЬМ ВІТАЕ ГІТЛЕРА

ПРАГА, 17.

ЯК ПАВЕДАМЛЯЮЦЬ З ДОРНА (ГАЛАНДЫЯ), БЫЛЫ ГЕРМАНСКІ ІМПЕРАТАР ВІЛЬГЕЛЬМ АПУБЛІКАВАЎ ЗАЯВУ, У ЯКОЙ ВІТАЕ ЗАМЕЖНУЮ ПАЛІТЫКУ ГІТЛЕРА.

КОНКУРС НА ЛЕПШЫ ЖАКТ

Узняць культурна-масавую выхаваўчую работу!

Ажывіць таварыскія суды ў жактах!

Конкурс на лепшы жакт ставіць сваёй мэтай палепшыць работу жактаў за ўсіх галінах, у тым ліку ў галіне культурна-масавай і выхаваўчай работы. Трэба сказаць, што да гэтага часу культурна-масавая і выхаваўчая работа ў жактах была ў занядбане. Гэта работа як у самых жактах, так і ў гаржыласаюзе стаіць на апошнім месцы.

Калі возьмем пытанні аб захаванні жыллоўчы, аб барацьбе за санітарнае становішча кватэр, аб выкананні фінансавых планаў і г. д. — дык адзіны метад мабілізацыі жыхароў — гэта **адміністраванне.** Замест растлумачальнай работы праўленні жактаў лічаць больш мэтазгодным зварачацца ў суд. А **жыптрэст,** напрыклад, той вынайшоў уласныя метады пакарання: у доме металістаў або ў дому на рагу Совецкай і Энгельса ён закрывае прыбральні, не чысціць двары і г. д., думаючы гэтым дабіцца лепшых адносін жыхароў да захавання жыллоўчы.

За апошні час назіраецца шмат выпадкаў зварочвання да суда з заявамі аб спагнанні кватэрнай платы, на явных узносах і нават чарговых узносах па падпісцы **на пазыку** «Другая пяцігодка». Праўленні жактаў № 15 і 29 лічаць, што толькі шляхам падачы іска ў суд можна спагнаць паявныя ўзносы, а праўленні жактаў №№ 5, 9, 23, 29, 31, 32 і інш. толькі праз суд і спагнаяюць узносы на падпісцы на пазыку.

Гэтыя факты сігналізуюць аб **буйных скажэннях** самой ідэі жыллёвай каапэрацыі, якая цалкам грунтуецца на добраахвотнасці, на свядомай дысцыпліне і на палітычна-масавай і культурна-выхаваўчай рабоце. Таму ў часе конкурса трэба асаблівую ўвагу звярнуць на ўзняцце культурна-масавай і палітычнай работы ў жактах.

Нарады жыхароў, палітычныя і культ масавыя гурткі, соцыялістычнае спаборніцтва, насценныя газеты, грамадскія буксіры — усе гэтыя метады павінны стаць неадлучнай часткай работы праўленняў жактаў.

Што датычыць **злосных** антыграмадскіх адносін з боку некаторых жыхароў да соцыялістычнай маемасці, да санітарнага становішча двароў і кватэр, да кватэрнай платы і іншых узносаў, дык не трэба забываць, што жактам у гэтым напрамку дана такая моцная зброя, як **таварыскі суд.** Аднак, таварыскія суды ў жактах працуюць вельмі кепска. Яны на працягу года ў лепшым выпадку, разглядаюць па адной—дзве справы.

Нядаўна жыллёвая камера нарсуда абследавала 40 жактаў. У 10 з іх таварыскія суды нават не выбраны, у 25 таварыскіх судаў выбраны, але зусім не працуюць і толькі пяць судоў разглядзелі па некалькі спраў.

Гаржыласаюз гэтай справе не аддае ніякай увагі. Тры разы склікала жыллёвая камера нарады прадстаўнікоў таварыскіх судоў і ва ўсіх трох выпадках па нарады з'явіліся па 15-20 асоб замест 70. Але гаржыласаюз з гэтага факта ніякіх вываадаў не зрабіў.

Праўленні жактаў не стваряюць патрэбных умоў для работы таварыскіх судоў. Стварэнне судоў не папулярызуецца сярод жыхароў. Як правіла, жыхары не ведаюць аб рабоце судоў, аб месцы іх працы, аб часе прыёма скаргаў. Нарэшце, члены партыі, якія ў большасці сталіц па чале таварыскіх судоў, не лічаць кіраўніцтва таварыскім судом сваёй партыйнай нагрузкай і не аддаюць ім патрэбнай увагі.

Гэта сведчыць аб яўна нядбайных адносінах да ажыццяўлення важнейшай дырэктывы партыі і ўрада аб арганізацыі таварыскіх судоў, якія асаблівы ва ўмовах нашых жактаў, дзе ёсць шмат інтэрнатаў, адыгрываюць вялікую ролю.

Конкурс на лепшы жакт павінен пакласці пачатак карэннай перабудове культмасавай і выхаваўчай работы ў жактах, у прыватнасці, у рабоце таварыскіх судоў. Трэба спадзявацца, што апошняе будзе ўлічана конкурсная камісія пры абмеркаванні пытання аб прэміяванні лепшых.

Шэндараў.

Калі будзе скончан выдавецкі корпус дома друку?

Начальнік будаўніцтва дома друку т. Беркоўскі і тэхнік будаўніцтва тав. **Купер** запэўнялі яшчэ ў чэрвені месяцы, што не пазней **1 верасня** гэтага года выдавецкі корпус дома друку, які вызначан для ФЗВ друкарні імя Сталіна, будзе зусім гатоў. Калі падыйшло 15 верасня, Беркоўскі і Купер перанеслі тэрмін сканчэння будаўніцтва на 20 верасня, 20 — на 25, 25 — 30. Зараз гутарка ідзе не аб днях і нават месяцах, аб тыднях і месяцах. Вялікія «аптымісты», кіруючыя будаўніцтвам дома друку, даюць надзею, што выдавецкі корпус будзе гатоў... не раней 1934 года.

Начальнік 3-га будаўнічага ўчастка т. **Голубеў** літаральна ніякай увагі не аддае будаўніцтву выдавецкага корпуса. Ён матывуе гэта тым, што ёсць больш важныя будоўлі. Пры гэтым т. Голубеў проста ігнэруе пастановы сваёй партыйнай групы. Яшчэ 2 кастрычніка партгрупа 3-га ўчастка прапанавала т. Голубеву прыняць усе захады да фарсавання будаўніцтва выдавецкага корпуса. Між тым на заўтра-ж т. Голубеў дае распараджэнне перакінуць вапну з дома друку на іншую пабудову. Разам з гэтым т. Голубеў зняў і рабочых. Так, ён «выкопвае» дырэктывы сваёй партгрупы.

Для ўстанаўлення адказнасці ёсць усе матэрыялы — ёсць і ўрубы і радыяграмы. Трэба толькі прысласць рабочых. Але сантэхбуд, які адказвае за гэту справу, не спяшаецца. Ён лічыць, што да пачатку зімы засталося яшчэ шмат часу.

Намеснік наркома лёгкай прамысловасці т. **Кац** ведае, што Белдзяржбуд вельмі мала робіць, каб забяспечыць сканчэнне выдавецкага корпуса. Аднак, т. Кац лічыта канкрэтнага не зрабіў, каб уздзейнічаць на Белдзяржбуд.

Грунтуючыся на абяцаннях т. Беркоўскага, што да 1 верасня корпус будзе гатоў, адміністрацыя друкарні імя Сталіна забрала памяшканне ФЗВ, машыны ФЗВ адпраўлены ў раённыя друкарні і даве новыя машыны адвезены на пляцоўку будаўніцтва дома друку.

Такоўкі будаўніцтва зацяпулася, вучні ФЗВ, пачынаючы з 1 верасня, нічога не робяць. Няма элементарных умоў для работы паборнага цэха, няма памяшкання для тэарытычнай вучобы, няма магчымасці пачаць прыём новых вучняў. Уся работа ФЗВ з-за адсутнасці памяшкання арыча ецца.

Адпаведныя арганізацыі павінны ўздзейнічаць на Наркамлегпрам, Белдзяржбуд і непасрэдных кіраўнікоў будаўніцтва, каб як мага хутчэй скончыць выдавецкі корпус. Усе магчымасці для гэтага ёсць. Патрэбна ўсяго якіх-небудзь 10 ударных дзён.

Рубін.

ДАСТАЎКА ДРОЎ МЕНСКУ ЗЛАЧЫННА ЗРЫВАЕЦЦА

Адгрузка дроў Менску

(у вагонах і процантах)

13 кастрыч.	14 кастрыч.	15 кастрыч.	16 кастрыч.	17 кастры
—	29 58%	—	44 88%	1. 26

За апошнюю пяцідзеўку Менск атрымаў усяго 86 вагонаў дроў. Гэта значыць пададзена паражняка пад нагрузку дроў толькі 34 проц. той колькасці, якая зацверджана камітэтам па перавозках. Зводка адгрузкі дроў Менску выдае з галавой людзей, якія з'яўляюцца простымі зрыўшчыкамі забеспячэння апалам прамысловасці і працоўнага насельніцтва горада. Кіраўніцтва упаўнаркамлёгпраму мала зрабіла, каб прымусіць начальніка жлобінскага эксплатацыйнага рабра **Верамеева** выканаць план па падачы вагонаў пад нагрузку дроў. Верамееў свядома зрывае дастаўку дроў пролетарскай сталіцы.

Што робіць дырэктар Менгаркопа **Ташкевіч?** Чаму ім нічога не зроблена, каб перавезці дровы з **Чэрвінскага** леспрамгаса аўтатрансхартам? Ён сядзічы ў габінеце дае адказы, што «дроў няма, і ў бліжэйшыя дні не будзе». Гэта замест таго, каб дагаварыцца з Галоўдартрансам, Аўтатрансам і перавезці дровы, якія ёсць у чэрвеньскім леспрамгасе і падвозны да шашы.

Адказны па забеспячэнню дровамі пролетарскіх цэнтраў з Лесаснабгата Лежін выкопвае ролю штампоўначка лічбаў ганебнай работы па адгрузцы дроў пролетарскім цэнтрам.

Паказаная вышэй «тройца» адказных работнікаў зусім забылася аб тым, якую задачу перад імі паставіла партыя і ўрад у справе забеспячэння апалам прамысловасці і працоўнага насельніцтва гарадоў.

Трэба з усёй рашучасцю а[illegible] і тое, што арганізацыі ў лесу мала цікавіліся ты[illegible] вы перавезці да пачатк[illegible] мовых перавозак. Яны на[illegible] ставіць рашуча пытанне перад [illegible] грунікай аб адгрузцы дроў гарадам толькі таму, што не была забяспечана падвозка іх да чыгункі.

Такое ганебнае становішча з дастаўкай дроў далей цярпець ні [illegible] якім фазе нельга. Органы пракуратуры, ЦКК-РСІ павінны сур'ёзна заняцца гэтым пытаннем, і прыцягнуць да адказнасці зрыўшчыкаў забеспячэння дровамі пролетарскіх цэнтраў.

Пастанова Менскай гарадской камісіі па чыстцы КП(б)Б

Пазначыць камісію па чыстцы партколектыва ЦСПСБ у складзе наступных таварышоў:

Старшыня камісіі **ГОРЫН П. О.**, член партыі з 1918 г., служачы, прэзідэнт Беларускай Акадэміі Навук.

Члены: **ГЕРАСІМАЎ**, член партыі з 1920 г., рабочы, і [illegible] трэста; **РАГОВІН Л. М.**, член партыі з 1924 г., рабочы завода [illegible]

МЕНГАРКАМІСІЯ ПА [illegible]

Паведамленне

ПК ЦКК КП(б)Б паведамляе, што 22 кастрычніка т. г. у Асіпавічах будзе працаваць выязная партканісія ЦКК КП(б)Б па разгляду партпрацаў Асіпавіцкага, Клічаўскага раёнаў наступных таварышоў:

ПА КЛІЧАЎСКАМУ РАЁНУ:

Гехлова С., Крывашэя М. Г., Гурскага І. Н., Баброўнічага Д. Я., Дышчынскага К. А., Капусціна І. П., Бурэйка А. А., Якімавец П. В., Іоох Хв. В., Крывашоў Н. Я., Барнышнін С. С., Пашкевіч М. М., Баргейка Г., Шэдура І. К.

ПА АСІПАВІЦКАМУ РАЁНУ:

Карнеева С. А., Васілеўскага А. Я., Гурэвіча М. Г., Міклуша Я. С., Звадзінскага С. Ф., Гацмана С. М., Лічыца З. Г., Лабкоўскага А. А., Кіякоўскага В. А., Каробчыца Браніслава, Вечар С. У., Іванова П. І., Канопенкова М. Н., Давідовіча С. М., Палепчука А. Р., Вешкурцава І. В., Іванова П. І., Катина Л. Я., Мазіна В. Ш., Мулярт Ю. В., Гіпатаўта А. К., Кісялеўскага І. Ф., Доўгі А. Е., Руды М. С., Альховец В. С., Окала-Кулак А. А., Кот С. А., Малашкевіч І. С.

Яўка пералічаных таварышоў абавязкова.

Пералічаныя таварышы павінны прадставіць партканісіі водгукі партгрупкі аб сваёй апошняй рабоце.

Сакратар ПК ЦКК КП(б)Б СУХАНАВА.

Культпроп ЦК КП(б)В склікае 20-Х г. г., у 6 г. веч. (пакой № 106)

нараду па пытанню аб ходзе выкладання марксізма-ленінізма ў ВТНУ і ВНУ гор. Менска

Выклікаюцца на нараду загадчыкі навучальных частак усіх ВНУ і ВТНУ Менска, загадчыкі кафедр па сацыяльна-эканамічных дысцыплінах, старшыні бюро секцыі навуковых работнікаў для справаздачы на нарадзе аб іх рабоце.

Сектар ВНУ культпропа ЦК

Адказны рэдактар Г. Н. БРАГІНСКІ.

Гукавы кіно-тэатр „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА“

Ад 19 кастрычніка

Выдатная артыстка ЖЭНІ ЮГО

ў замежным трукавым мастацкім фільме

У ПРАГРАМЕ: 1) экстраны выпуск:—палёт стратастата „СССР“ на вышыні 19 тыс. метраў 2) **гукавы кіно журнал № 24**

ЗМЕСТ: 1. т.т. Сталін, Кіраў і Варашылаў на Белморбудзе 2. Прыезд Эрыо ў СССР. 3. Франц. міністр Пьер Кот у СССР і інш.

Штодзённа 4 сеансы. Пачатак у 6. 7.30, 9 і 10-30. Каса ад 1 г. дня.

Кіно Інтэрнацыянал — Замежны фільм **БАНДЫТКА**

Кіно „Пролетарый“ — Мастацкі совецкі фільм **Цана чалавека** драма ў 6 частках

ДЗІЦЯЧЫ ГУКАВЫ кіно-тэатр — **ДВА ДРУГА МАДЭЛЬ І ПАДРУГА** камедыя ў 7 частках

„СПАРТАК“ Каса з 4-х гадзін дня. — усходні мастацкі фільм **ПЕРШАЕ І АПОШНЯЕ** драма ў 7-мі частках

КУРСЫ па падрыхтоўцы **планавікоў і старшых ўлікова-аперацыйных работнікаў, старшых і галоўных бухгальтараў**

АДКРЫВАЮЦЦА **пры Усебеларускай канторы Дзяржбанка** ў гор. Менску Тэрмін навучання—6 месяцаў.

Слухачы забяспечваюцца стыпендыяй і інтэрнатам. Падрабязна азнаёміцца можна ў кожным раённым аддзяленні Дзяржбанка, і ў сектары кадраў Усебеларускай канторы (г. Менск)

Прыём заяў—да 1 лістапада 1934 г

СЕКТАР КАДРАЎ.

Смілавіцкі с. г. тэхнікум раслінаводства

АБВЯШЧАЕ НАБОР НА 3-МЕСЯЧНЫЯ

ПАДРЫХТОЎЧЫЯ КУРСЫ

пры тэхнікуме ў колькасці 60 асоб з адукацыяй не ніжэй 6 гр. сямігодкі, **для студэнцкага набора ў тэхнікум**

Курсанты карыстаюцца правамі студэнтаў тэхнікума.

Прыём заяў да 25-Х-33 года.

ДЫРЭКЦЫЯ.

Бабруйская аўтаманцёрная школа дарбудвуча

паўторна даводзіць да ведама ўсіх асоб падаўшых свае дакументы для паступлення ў памянёную школу ў асенні прыём гэтага года, што **у сувязі з рэарганізацыяй гэтай школы ў нуровую базу, усе дакументы ў верасні месяцы г. г. былі накіраваны Гомельскаму аўтадарожнаму тэхнікуму,** а таму асобы, жадаючыя атрымаць свае дакументы, павінны **звярнуцца ў гэты тэхнікум** па наступнаму адрасу: г. Гомель, Совецкая вул., № 76, аўтадарожнаму тэхнікуму. **ДЫРЭКЦЫЯ.**

З прычыны неаплаты рахункаў Магілеўскае Аддзяленне Дзяржбанка ПРАДАЕ

паступныя тавары:

1. АПТЭКАКІРАЎНІЦТВА.

1. Гумавыя выбары на суму руб. 1746—36 к.
2. Парфумерыя „ 4070—75
3. „ „ 4926—95
4. „ „ 3408—95
5. „ „ 6987—95
6. „ „ 5004—95
7. „ „ 2991—52
8. „ „ 2084—25
9. „ „ 3839—24
10. „ „ 2158—59
11. Зубны парашок вазелін і крэм „ 1044—18
12. Віно „Кагор“ № 2 „ 8037—05

2. ОРС ДРЭЎЛЕСХІМСАЮЗА

13. Рыба трэска на суму руб. 1615—94

3. Т-ВА ПРЫХІЛЬНІК ДЗЯЦЕЙ

14. Парфумерыя на суму руб. 2199—25

4. ШОРНАЯ ФАБРЫКА

15. Канат Сізальскі на суму руб. 14365—15

5. БАЗА БКС

16. Парфумерыя на суму руб. 1196—58
17. „ „ 6398—10
18. „ „ 6996—49
19. Лаўровы ліст „ 8904—30
20. Гатовая вопратка „ 6498—80

Магілеўскае Аддзяленне Дзяржбанка.

БАЛАНС дзяржаўнага трэста „БЕЛКМО“

на 1/1-32 г. і на 1/1-33 г.

АКТЫЎ

	Сума На 1-1-32 г.	Сума На 1-1-33 г.
1. Будынкі і будыніны	2.983.449[29]	4.190.055—82
2. Абсталяванне, сілав. устан. і машыны	2.595.175[44]	3.239.397—82
3. Інструманты	20.584—27	26.645—71
4. Транспарт	61.603[13]	110.586—98
5. Гаспадарчы інвентар	180.857[67]	241.569—02
6. Жылёвыя і камунальныя пабудовы	295,027[22]	460.648—76
7. Нясканчан. пабудовы і капіт. рамонт	702.696[79]	997.923—27
8. Абсталяванне да ўстаноўкі	382.126[98]	249.530—94
9. Запаснае абсталяванне	108.990[10]	124.612—91
10. Паі, акцыі і каштоўныя паперы	35.639[94]	59.745—97
11. Уклады	441.094[92]	1.151.348—22
12. Сыравіна—асноўная і дапаможная	4.834.515[25]	3.005.055—71
13. Паліва	43.152[86]	123.426—28
14. Паўфабрыкаты	1.025.084[23]	1.122.244—25
15. Нясканчаная вытворчасць і загатоўка	129.934[14]	245.701—64
16. Тавары і гатовыя вырабы	2.336.409[04]	2.075.138—73
17. Грашовыя сродкі	9.956[42]	31.275—06
18. Разлікі з Дзяржбанкам	1.906.668[84]	1.276.562—30
19. Разлікі з Наркамфінам	3.753.773—	2.218.413—81
20. Дэбіторы	1.204.072[66]	734.257—82
21. Выдаткі наступных гадоў	299.280[44]	23.631—31
БАЛАНС	23.350.092[63]	21.707.772—33

ПАСІЎ

	Сума На 1-1-32 г.	Сума На 1-1-33 г.
1. Статутны капітал	7.702.405—27	9.872.338—35
2. Амартызацыйны капітал	583.288—31	866.239—
3. ФПБР	428.171—90	979.277—58
4. Іншыя сродкі	196.111—46	186.687—43
5. Резервы	408.954—94	496.864—85
6. Доўгатэрміновае фінансаванне	1.038.246—88	1.275.988—33
7. Разлікі з Дзяржбанкам	2.017.462—58	2.264.305—57
8. Разлікі з Наркамфінам	872.546—	1.373.107—05
9. Крэдыторы	2.478.042—20	1.418.176—89
10. Даходы наступных гадоў	10.065—94	— —
11. Прыбытак	7.614.797—15	2.974.737—28
БАЛАНС	23.350.092—63	21.707.772—33

РАХУНАК ПРЫБЫТКАЎ І СТРАТ

СТРАТЫ

	СУМА
1. Ад рэалізацыі	2.732.450—52
2. Процанты ўплочаныя	35.675—78
3. Агульна-адмін. выдаткі	194.610—42
3. Выдаткі па збыту	16.198.506—96
5. Ад ліквід. выбыўш. маемасці	26.787—55
6. Іншыя выдаткі	950.933—89
7. Чысты прыбытак	2.974.737—28
БАЛАНС	23.113.702—40

ПРЫБЫТКІ

	СУМА
1. Ад рэалізацыі	22.363.098—90
2. Ад рэалізацыі выбыўшай маемасці	1.257—01
3. Іншыя даходы	749.346—49
БАЛАНС	23.113.702—40

РАЗМЕРКАВАННЕ ПРЫБЫТКА

1. Адліч. у Дзяржбюджэт—14 проц. . . . . 416.315 р.
2. У ФУБР—9 проц. . . . . 267.726—36
3. у статутны капітал 77 проц. . . . . 2.290.695—99 к.

Усяго . . . . . 2.974.737р. 28 к.

Дырэктар трэста ТРЫФОНІК
Нам. галоўбуха ЛЯХАВІЦКІ

Гэты баланс разгледжан і зацверджан балансавай камісіяй Наркамснаба БССР на пасяджэнні 12-VI-1933 г. і да друкавання дазволен.

Прамкіраўніцтва Наркамснаба БССР КОБЕЛЕЎ

Менск, друкарня «Зоркі».

Галоўлітбел № 332.